ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 44 (1681) | Пятніца, 1 чэрвеня 1962 года | Цана 4 кап.

ЗВАРОТ

ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР

ДА ЎСІХ РАБОЧЫХ І РАБОТНІЦ, КАЛГАСНІКАЎ І КАЛГАСНІЦ, РАБОЧЫХ І РАБОТНІЦ САЎГАСАЎ, САВЕЦКАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ, ДА ЎСЯГО САВЕЦКАГА НАРОДА

Дарагія таварышы!

Цэнтральны Камітэт партыі і Савецкі ўрад вырашылі звярнуцца да савецкага народа з гэтым пісьмом і разгледзець у ім некаторыя сур'ёзныя пытанні развіцця нашай сельскагаспадарчай вытворчасці і задавальнення ўзрастаючых запатрабаванняў насельніцтва ў прадуктах харчавання, асабліва ў мясе і масле. Партыя і ўрад лічаць неабходным адкрыта сказаць аб тых цяжкасцях, якія ўзнікаюць у забеспячэнні насельніцтва гарадоў мяснымі прадуктамі, і выкласці меры па пераадоленню гэтых цяжкасцей у бліжэйшы час.

Савецкія людзі ведаюць, з якой настойлівасцю наша партыя змагаецца за павелічэнне вытворчасці сельскагаспадарчых прадуктаў.

Калі азірнуцца назад і ўважліва агледзець шлях, які прайшла наша сельская гаспадарка пасля верасневага Пленума ЦК КПСС, які адбыўся ў 1953 годзе, то можна з поўнай падставай сказаць, што працаўнікі вёскі многае зрабілі для ўздыму сельскагаспадарчай вытворчасці. Валавая прадукцыя сельскай гаспадаркі з 1953 па 1961 год павялічылася ў 1,6 раза, вытворчасць збожжа за гэты час узрасла з 5 мільярдаў 36 мільёнаў пудоў да 8 мільярдаў 422 мільёнаў пудоў, што з'яўляецца вялікай перамогай. Цяпер патрэбы краіны ў збожжы на харчовыя мэты поўнасцю задавальняюцца. Вытворчасць мяса (у забойнай вазе) за гэты ж час узрасла з 5 мільёнаў 800 тысяч тон да 8 мільёнаў 800 тысяч тон, малака — з 36 мільёнаў 500 тысяч тон да 62 мільёнаў 500 тысяч тон, яек — з 16 мільярдаў штук да 29 мільярдаў штук; выпрацоўка цукру з цукровых бураков павялічылася з 3 мільёнаў 434 тысяч тон да 6 мільёнаў 85 тысяч тон і г. д.

Аддаючы належнае намаганням працаўнікоў калгасаў і саўгасаў, мы ні ў якім разе не можам быць задаволены вынікамі, дасягнутымі ў сельскагаспадарчай вытворчасці. Яе ўзровень пакуль яшчэ недастатковы, каб забяспечыць узросшы попыт насельніцтва на некаторыя прадукты харчавання і перш за ўсё на прадукты жывёлагадоўлі.

У чым жа справа?

Усякаму непрадузятаму чалавеку лёгка зразумець, што цяжкасці, аб якіх ідзе гутарка, з'яўляюцца цяжкасцямі нашага бурнага росту.

Савецкая эканоміка развіваецца імкліва. Насельніцтва нашай краіны, асабліва гарадское, расце вельмі хутка. З 1953 па 1961 год яно павялічылася на 29 мільёнаў, у тым ліку гарадское на 28 мільёнаў чалавек. З году ў год растуць грашовыя даходы працоўных. У 1961 годзе яны павялічыліся ў параўнанні з 1953 годам на 42 мільярды рублёў, або на 87 працэнтаў.

Умовы сацыялізма даюць кожнай савецкай сям'і ўпэўненасць у заўтрашнім дні. У нас даўно знята праблема беспрацоўя, дзяржава забяспечвае людзей у старасці і пры страце працаздольнасці. Яна бярэ на сябе вялізарныя расходы па жыллёваму будаўніцтву, бясплатнаму медыцынскаму абслугоўванню, бясплатнаму навучанню ў школах і вышэйшых навучальных установах.

Калі ў капіталістычных умовах кожная працоўная сям'я вымушана большую частку сваіх даходаў траціць на кватэрную плату, на медыцынскае абслугоўванне і аплату навучання дзяцей, адкладваць збяражэнні на чорны дзень, то наша савецкая сям'я большую частку сваіх даходаў выкарыстоўвае на тое, каб лепш харчавацца, апранацца. Гэта, натуральна, параджае высокі попыт на такія прадукты харчавання, як мяса, каўбасныя вырабы, масла. Паглядзіце, таварышы, на колькі больш пачалі ў нас за апошнія гады купляць высокакаштоўных прадуктаў харчавання! Напрыклад, у 1953 годзе праз дзяржаўны гандаль было прададзена мяса і мясных прадуктаў 1 мільён 757 тысяч тон, а ў 1961 годзе — 4 мільёны 33 тысячы тон, малака і малочных прадуктаў адпаведна — 1 мільён 980 тысяч тон і 9 мільёнаў 393 тысячы тон, масла — 330 тысяч і 632 тысячы тон, цукру — 2 мільёны 410 тысяч тон і 4 мільёны 550 тысяч тон, яек — 2 мільярды 45 мільёнаў і 5 мільярдаў 860 мільёнаў штук.

Няма сумнення, што ў далейшым патрэбы савецкіх людзей у тым ліку і ў прадуктах харчавання, будуць расці яшчэ хутчэй. Пастаянны рост народнага дабрабыту — закон сацыялістычнага грамадства, прадмет галоўных клопатаў Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада.

Сакавіцкі Пленум ЦК КПСС, які адбыўся нядаўна, усебакова ўзважыў нашы магчымасці і намеціў канкрэтныя практычныя меры, накіраваныя на тое, каб забяспечыць высокі ўзровень вытворчасці прадуктаў харчавання ў краіне.

Што для гэтага трэба зрабіць? Перш за ўсё, неабходна ўсямерна ўзмацніць дапамогу калгасам і саўгасам у развіцці магутнай матэрыяльна-тэхнічнай базы, рашуча палепшыць выкарыстанне зямлі і тэхнікі, павысіць узровень арганізацыі працы, зрабіць здабыткам усіх калгасаў і саўгасаў попыт перадавікоў сельскагаспадарчай вытворчасці і дасягненні сельскагаспадарчай навукі.

Апрача таго, трэба яшчэ больш узмацніць матэрыяльную зацікаўленасць усіх калгаснікаў, рабочых саўгасаў і спецыялістаў у развіцці грамадскай гаспадаркі, у максімальным павелічэнні вытворчасці сельскагаспадарчых прадуктаў пры найменшых затратах працы і сродкаў.

Трэба сказаць, дарагія таварышы, што за апошні час Цэнтральны Камітэт партыі і Савецкі ўрад не раз абмяркоўвалі пытанне аб узмацненні матэрыяльна - тэхнічнай дапамогі калгасам і саўгасам з тым, каб стварыць лепшыя ўмовы для арганізацыі вытворчасці, у тым ліку і для жывёлагадоўлі.

Акрамя поўных асігнаванняў па бюджэту, калгасы за кошт зніжэння цэн на машыны і іншыя тавары вытворчага прызначэння атрымліваюць значныя дадатковыя сродкі.

У мінулым годзе былі зніжаны цэны на сельскагаспадарчыя машыны, запасныя часткі, гаручае і ўстаноўлены льготы па падаходнаму падатку. У разліку на год гэта дае эканомію калгасам 900 мільёнаў рублёў. У лютым 1962 года Савет Міністраў СССР прыняў пастанову аб зніжэнні цэн для калгасаў на будаўнічыя матэрыялы, метал і металавырабы. У разліку на год гэта дае калгасам эканомію 250 мільёнаў рублёў. Акрамя таго, саўгасам сёлета выдзелены звыш устаноўленага плана асігнаванні на капітальнае будаўніцтва для жывёлагадоўлі ў суме 210 мільёнаў рублёў.

Такім чынам, за кошт зніжэння цэн на ўказаныя матэрыялы і дадатковых асігнаванняў на патрэбы жывёлагадоўлі, сельская гаспадарка атрымлівае дадаткова і мільярд 360 мільёнаў рублёў у новых грошах, або 13 мільярдаў 600 мільёнаў рублёў у старых грошах. Гэта вельмі сур'ёзны ўклад у справу развіцця сельскай гаспадаркі.

Важнае значэнне для развіцця сельскай гаспадаркі маюць таксама правільныя і эканамічна абгрунтаваныя закупачныя цэны на сельскагаспадарчую прадукцыю. Яны павінны поўнасцю пакрываць выдаткі вытворчасці і разам з тым забяспечваць неабходныя накапленні для расшыранага ўзнаўлення.

За апошні час партыя і ўрад ажыццявілі таксама рад важных мер па ўпарадкаванню нарыхтоўчых цэн на прадукты сельскай гаспадаркі. Нарыхтоўчыя цэны на сельскагаспадарчыя прадукты былі павышаны. У выніку эканоміка калгасаў і саўгасаў умацавалася, матэрыяльная зацікаўленасць калгасаў і калгаснікаў прыкметна ўзрасла. Дзяржава выдаткавала на гэтыя мэты многія мільярды рублёў. Але, як паказвае вопыт развіцця гаспадаркі, гэтых укладанняў яшчэ недастаткова для таго, каб пераадолець сур'ёзнае адставанне жывёлагадоўлі, найбольш працаёмкай галіны сельскай гаспадаркі.

Кожны дарослы чалавек ведае, што, перш чым з'явіцца на стале мяса, малако і масла, трэба патраціць шмат працы, асабліва ў нашых суровых кліматычных умовах, калі ў большасці раёнаў краіны сем—восем месяцаў працягваецца асенне-зімовы перыяд, што ўскладняе ўтрыманне жывёлы і вытворчасць кармоў. Патрабуюцца вялізарныя затраты сродкаў і працы для будаўніцтва жывёлагадоўчых памяшканняў, механізацыі і электрыфікацыі ферм.

Пры цяперашнім узроўні механізацыі жывёлагадоўлі і прадукцыйнасці працы ў калгасах і саўгасах затраты на вытворчасць мяса і малака вельмі вялікія, яны значна перавышаюць тыя цэны, па якіх дзяржава купляе гэтыя прадукты.

У выніку гэтага ў нас яшчэ шмат калгасаў, дзе жывёлагадоўля прыносіць не прыбытак, а страты і часам з'ядае нават тыя накапленні, якія калгас атрымлівае ў іншых галінах сваёй гаспадаркі. Нельга не задумацца над такімі лічбамі. Сабекошт 1 цэнтнера буйной рагатай жывёлы (у жывой вазе) у 1960 годзе быў роўны 91,6 рубля, у 1961 годзе — 88 рублям, а закупачная цана — 59,1 рубля; сабекошт цэнтнера свініны ў 1960 годзе быў 122,6 рубля, у мінулым годзе — 118 рублёў, а закупачная цана — 82,3 рубля; птушкі — сабекошт ў 1960 годзе — 140,5 рубля, ў 1961 годзе — 133,5 рубля, а закупачная цана — 82,2 рубля.

Хоць, як бачыце, сабекошт мяса і малака крыху знізіўся, але ўсё ж закупачныя цэны не пакрываюць фактычных затрат на вытворчасць мяса. Выходзіць, што калгас церпіць страты на кожным кілаграме мяса і малака, атрыманага ім. Ясна, што пры такім становішчы калгас матэрыяльна не зацікаўлены ў павелічэнні вытворчасці гэтых прадуктаў. Дзе ж выйсце? Трэба павысіць закупачныя цэны на мяса і малако, каб вытворчасць гэтых прадуктаў была эканамічна выгаднай для

(Заканчэнне на 2-й стар.).

КВІТНЕЙ, ЖЫЦЦЁ!

Фотаэцюд Ул. КРУКА.

Эдзі АГНЯЦВЕТ

Жуліяна

Малой дачцы Патрыса ЛУМУМБЫ

На сцяне — начныя цені,
Быццам гнуткія ліяны.
Вочы чорныя ў здзіўленні
Раскрывае Жуліяна:

— Дзе мой тата?
Столькі часу
Усё не едзе ён дадому! —
Шмат пытанняў ёсць няясных,
Шмат чаго ёй невядома.

Засынае Жуліяна.
На шчаце сляза застыла.
Сніцца поўдзень палымяны,
Сніцца родны тата мілы.

На руках дачку гайдае
І цалуе доўга-доўга,
Казкі добрыя складае —
Больш за ўсё — аб дзецях
Конга.

І скрозь сон крычыць малая:
— Падары мне, тата, кветку! —
... А на крэсле бант палае
І ляжыць сукенка ў клетку.

Брат старэйшы Жуліяны
Нахіляецца над ложкам:
— Бацька прыйдзе заўтра рана,
Пачакай яшчэ хоць трошкі...

Але сам глядзіць тужліва
І сястры складае казку...
Потым, раніцай, імкліва
Ён лістоў прыносіць вязку.

Вельмі рада Жуліяна,
Адусюль прыходзяць маркі:
З Прагі,
Мінска
і Гаваны,
Ды з блакітнае Іграркі.

Людзі добрыя ад сэрца
Дзетак любяць кангалезскіх.
З Беларусі—у канверце—
Хтосьці ім прыслаў пралескі.

Кветка забіць сінім вокам
І дзяўчынка шэпча ў цішы:
— Мабыць, тата наш далёка,
Толькі ён адзін не піша...

Сяргей ГРАХОЎСКІ

МІР ВАМ, ДЗЕЦІ ПЛАНЕТЫ ЗЯМЛЯ!

НА СКРЫЖАВАННІ вуліц спыніліся тралейбусы і машыны, на некалькі хвілін замёр рух на галоўнай магістралі горада. Вадзіцелі, шафёры і пасажыры ў такіх выпадках звычайна злуюць і хвалююцца, але на гэты раз яны добрым позіркам, з цёплаю ўсмешкаю праводзяць тых, хто прымусіў іх чакаць. Узяўшыся за ручкі, спакойна пераходзяць вуліцу дзеці. Для іх спынены рух, для іх зялёным святлом гараць усе светафоры, за іх кожным крокам сочаць замілаваныя, уважлівыя і шчырыя вочы, іх аберагаюць цёплыя і ласкавыя рукі заўсёды занятых і заклапочаных людзей.

Ідуць маленькія грамадзяне ў дзіцячыя сады і школы, на экскурсіі і на прагулкі. Яны пра нешта гавораць, яны занятыя сваімі маленькімі клопатамі, сваімі радасцямі і думкамі. Пра што яны гавораць, пра што думаюць? Пра новыя цацкі і прыгожыя кніжкі, пра цікавыя кінажарціны і, вядома, пра першых савецкіх касманаўтаў. Яны мараць хутчэй вырасці і стаць побач са сваімі бацькамі, каб у руках быў не папяровы караблік, не фанерны самазвал, а вялікія сапраўдныя машыны, на якіх бы яны адкрылі бязмежныя прасторы радзімы і сусвету.

Ідуць дзеці, ідзе будучае чалавецтва, наша радасць, наша надзея. Любоўю і ласкай сагрэты іх кожны дзень, кожны крок на шляху ў вялікае жыццё. Мы пабудавалі для сваіх дзяцей яслі і сады, школы і палацы, тэатры і дзіцячыя чыгункі, пасадзілі паркі, адкрылі лагеры на ўзбярэжжы Чорнага мора і на Енісеі, на Нарачы і на Дняпры. А сёння ў кожным куточку нашай Савецкай зямлі ўзвіваюцца на флагштоках трапяткія сцягі — пачалося лагернае піянерскае лета. Мільёны хлапчукоў і дзяўчатак ідуць па мурожных сцежках да празрыстых рэчак і ціхіх азёр, пяюць звонкія песні ля кастроў і ўглядаюцца ў зорнае неба. Яны падоўгу сочаць, як мігаюць далёкія планеты, нібы намячаюць арбіты для будучых караблёў. Іх суджана паслаць у бязмежжа сусвету пакаленню сягонняшніх піянераў. Гарэзныя і бесклапотныя Вані і Колі, Валодзі і Віці, Наташы і Тані вырастуць, падужэюць, набяруцца сіл і розуму ў свайго народа, узмужнеюць іх крылы для вялікіх работ і адважных палётаў. Яны ўзбагацяць чалавецтва нябачанымі адкрыццямі для шчасця сучаснікаў і нашчадкаў.

Мы ўсе з вялікім захапленнем і радасцю глядзелі на нашых дзяцей у дні нядаўняга піянерскага свята. Колькі іскрыстай весялосці, колькі талентаў, колькі харства прайшло перад нашымі вачыма: спартсмены і авіямадэлісты, спевакі і танцоры, юнаты і радыётэхнікі ішлі па праспектах і плошчах сталіцы, па вуліцах гарадоў і сёл. Гэта—наша надзейная змена, гэта — наша апора, цвет нашага народа, гэта — пакаленне неспакойных летуценнікаў, якому належыць будучае. Камуністычная партыя запісала ў сваёй праграме, як адзін з непарушных законаў для кожнага савецкага чалавека — «клопаты пра выхаванне дзяцей».

На нашых вачах нараджаюцца новыя гарады ў Сібіры і ў Казахстане, на Урале і за Палярным кругам, на беразе Дзвіны і ў глыбі Палесся. І скрозь, перш за ўсё, будуюцца дзіцячыя сады і школы. Пры мне закладваліся першыя падмуркі самага юнага горада ў Беларусі, цудоўнага Нафтаграда каля старажытнага Полацка. У першыя месяцы тут былі толькі бетоншчыкі і муляры, тынкоўшчыцы і экскаватаршчыкі, але яны ўжо думалі пра дзяцей, што народзяцца на гэтай зямлі, і перш чым будаваць завод, жылыя дамы і дарогі, яны паставілі тры першыя светлыя вялікія будынкі — дзіцячыя яслі, школу і дзіцячы сад, абсадзілі іх клёнамі, зрабілі адкрыты басейн для маленькіх навасёлаў, каб яны ў летнюю спёку не бегалі да імклівай і глыбокай Дзвіны. І так усюды, такі ўжо характар савецкіх людзей. У нашай краіне няма ніводнага дзіцяці, якое б не хадзіла ў школу, якое б не ведала ўсіх радасцей маленства. Усё, што сёння робім мы, належыць ім, тым, што пакуль яшчэ гушкаюцца ў калысках і вучацца хадзіць, што ідуць у свой першы паход і здаюць экзамены на атэстат сталасці. Гэта нашы дзеці, нашы заўтрашнія вучоныя і паэты, майстры і дзяржаўныя дзеячы, хлебаробы і касманаўты. Мы гадуем іх і вучым, беражом і загартоўваем, ахоўваем іх спакойны сон і даём дарогу — няхай смела крочаць у свой заўтрашні дзень.

Дзеці заўсёды вераць дарослым, спадзяюцца на іх, моцна трымаюцца за дужыя рукі бацькоў.

Калі я пішу гэтыя радкі, мае дзеці моцна спяць. Я чую, як яны роўна дыхаюць у цішыні пакоя. Соладка спяць у гэты позні час усе дзеці нашай краіны. Над імі чыстае зорнае неба і спакойная мірная ноч. Але, мабыць, не ў аднаго мяне абурэнне сціскае сэрца, калі я чую ў начным выпуску апошніх паведамленняў, што на востраве Раждзяства маньякі з Пентагона зрабілі чатырнаццаты выбух атамнай бомбы, што страшэнны грыб плыве над акіянам, дыхаючы смерцю на ўсё жывое, што недзе скаланаецца зямля і палае неба, што яшчэ ў страшным сне ўскрыкваюць людзі Хірасімы. Яны, як праклёны, успамінаюць словы «Энола Гэй». Гэта, мабыць, самыя страшныя словы, якія ведае чалавецтва. Так зваўся амерыканскі бамбардзіроўшчык «Б-29». Гэта з яго 6 жніўня 1945 года была скінута першая амерыканская атамная бомба на мірны горад Хірасіму. «Ужыўшы атамную бомбу першымі, мы апусціліся да маральнага ўзроўню, характэрнага для варвараў сярэдніх вякоў», — пісаў амерыканскі адмірал Легі. А штурман самалёта «Энола Гэй» капітан Люіс запісаў у бартавым журнале: «Я шукаю слоў і не знаходжу іх. Божа! Што мы зрабілі?» На гэтае пытанне адказала чалавецтва абурэннем і нянавісцю, бурай пратэстаў і пракляццем забойцам мірных людзей двух японскіх гарадоў. У 8 гадзін 15 мінут яшчэ спакойна спалі дзеці Хірасімы, маці ходзілі на дыбачках, каб не пабудзіць іх. Страшэнны, ніколі не бачаны бляск асляпіў усё жывое. Хто ўбачыў яго, ужо ніколі не прачнецца.

Гэта было 17 гадоў назад.

Народы свету вынеслі свой прысуд атамным пачварам, якія трызняць новымі Хірасімамі і Нагасакі. Усе маці зямлі, тулячы да сэрца сваіх дзяцей, гнеўна заяўляюць: «Не дапусцім! Нашы дзеці і дзеці нашых дзяцей павінны жыць здаровымі і шчаслівымі!»

Колькі сіл, колькі намаганняў аддаюць людзі ўсёй планеты, каб абараніць сябе і сваіх дзяцей ад пагрозы атамнай смерці! Поўнага раззбраення, ліквідацыі і забароны ядзернай зброі патрабуе Савецкі ўрад. Як настойліва і паслядоўна, горача і няўхільна дамагаецца гэтага Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў! Гэтага патрабуе наш народ, усё сумленнае чалавецтва, гэтага патрабуюць розум і чыстыя сэрцы ўсіх людзей добрай волі, пра гэта мараць усе маці свету. Да мацярок сённяшніх салдат звяртаецца нарвежская жанчына Сальвейг Віке: «Можа здарыцца так, што не хто іншы, як твой сын, выпусціць ракету, якая нясе разбурэнне большай часткі свету... Не, мы не хочам гэтага... Далоў атамную зброю! Тады настане дзень, калі мы з радасцю далучымся да бесклапотных гульняў нашых дзяцей, да іх светлых мараў пра будучае!» Так гавораць усе, каму дорага гэтае будучае, хто жадае міру, шчасця і росквіту на зямлі.

Але трывога не пакідае нашы сэрцы. Атамны псіхоз за акіянам прыходзіць многіх да поўнага адчаю. Газета «Таймс» надрукавала адказ васьмігадовага хлопчыка на пытанне: «Кім бы ты хацеў быць, калі станеш дарослым?» Маленькі амерыканец адказаў: «Жывым!» Што робіцца ў сэрцы гэтага дзіцяці, як атручана яго маленства!

Нашы дзеці на такое ж пытанне даюць тысячы розных адказаў. Яны называюць самыя высакародныя прафесіі, аб якіх мараць, расказваюць пра свае далёкія планы, пра самыя смелыя летуценні. Яны цвёрда вераць у сілу сваіх бацькоў, у міралюбівую непахісную мудрасць свайго народа і партыі камуністаў, яны ведаюць, што шчасце належыць ім.

Але каб спакойна спалі дзеці на зямлі, усе людзі добрай волі павінны пільна ахоўваць іх сон, іх спакой, іх мірныя гульні і светлыя мары. Мы не можам быць спакойнымі, пакуль дрыжыць зямля ад ядзерных выпрабаванняў, а ў атмасферы носіцца смяротны атамны пыл.

Гэта прэзідэнт Кенедзі падпісаў Пентагону заяўку на 30 ядзерных выбухаў. Чатырнаццаць прагрымела ўжо над востравам Раждзяства. Яны пагражаюць поўнай слепатой людзям, якія жывуць паблізу выпрабаванняў, яны могуць парушыць пояс радыяцыі, які акружае зямны шар, яны могуць пашкодзіць далейшаму асваенню космасу.

Але расце і шырыцца фронт барацьбітоў за мір. Воля людзей мацнейшая за любую зброю. Чалавек стварыў атамную бомбу, ён яе павінен і ліквідаваць. Атамная энергія — гэтае вялікае адкрыццё нашага часу — павінна служыць людзям, прыносіць ім шчасце і радасць, упрыгожваць зямлю.

Нашы дзеці нараджаюцца для шчасця, для вялікай будучыні, яны пойдуць далей сваіх бацькоў па шляху нябачанага прагрэсу, узбагацяць чалавецтва сваім геніем, сілай высакароднага духу, раскрыюць усе тайны сусвету. Патрэбен толькі мір, толькі спакой, разумная садружнасць усіх людзей.

Сёння — Міжнародны дзень абароны дзяцей. Расціце, гуляйце і спіце спакойна, усе дзеці зямлі! Мы ахоўваем ваш спакой, мы не дапусцім атамнага пажару! Так гавораць камуністы, так гаворыць савецкі народ. А ў савецкіх людзей словы ніколі не разыходзяцца са справай. Сведка гэтаму — гісторыя.

Мір вам, дзеці планеты Зямля, мір вам, добрыя людзі!

У САВЕЦЕ МІНІСТРАЎ СССР

З мэтай павышэння матэрыяльнай зацікаўленасці калгасаў і саўгасаў у рэзкім павелічэнні вытворчасці і здачы жывёлы і птушкі дзяржаве Савет Міністраў Саюза ССР пастанавіў:

Павысіць з 1 чэрвеня 1962 г. закупачныя цэны на жывёлу і птушку, прадаваемыя калгасамі дзяржаве, у сярэднім па краіне на 35 працэнтаў і зацвердзіць закупачныя цэны: на буйную рагатую жывёлу і свіней па саюзных рэспубліках у наступных размерах:

(у рублях за цэнтнер жывой вагі)

	буйная рагатая жывёла сярэдняй укормленасці	свінні беконныя і тлустыя	свінні мясныя
РСФСР	90	125	105
Украінская ССР	88	120	100
Беларуская ССР	97	135	115
Узбекская ССР	89	135	115
Казахская ССР	85	125	105
Грузінская ССР	97	135	115
Азербайджанская ССР	97	135	115
Літоўская ССР	97	135	115
Малдаўская ССР	88	120	100
Латвійская ССР	92	130	110
Кіргізская ССР	89	135	115
Таджыкская ССР	89	135	115
Туркменская ССР	89	135	115
Армянская ССР	97	135	115
Эстонская ССР	92	130	110

На курэй і куранят — 1 рубель 40 капеек, гусей — 1 рубель, качак — 1 рубель 10 капеек і на індычак — 1 рубель 60 капеек за кілаграм жывой вагі.

На малочных парасят жывой вагой да 6 кілаграмаў — 1 рубель 50 капеек і на трусоў: 1 катэгорыі — 90 капеек і II катэгорыі — 78 капеек за адзін кілаграм жывой вагі.

Цяляты I катэгорыі аплачваюцца па цэнах на жывёлу сярэдняй укормленасці, а цяляты II катэгорыі — па цэнах на жывёлу ніжэй за сярэднюю ўкормленасць. Алені і які (сарлыкі) аплачваюцца па закупачных цэнах, устаноўленых на буйную рагатую жывёлу адпаведнай укормленасці. Парасяты вагой ад 6 да 20 кілаграмаў і нестандартныя свінні аплачваюцца па цане на 20 працэнтаў ніжэй за цэны на свіней мясных. Нестандартная буйная рагатая жывёла (худая) аплачваецца па цане на 20 працэнтаў ніжэй за цэны на жывёлу ніжэй сярэдняй укормленасці.

Захаваць даплату да цэн на раманаўскіх авечак, прадугледжаную пастановамі Савета Міністраў СССР ад 9 красавіка 1955 г. № 664 і ад 10 верасня 1959 г. № 1053. На авечак іншых парод вагой ад 16 кілаграмаў і вышэй з воўнавым і паўвоўнавым покрывам, які адпавядае стандарту на футравыя і шубныя аўчыны, устанавіць з 1 чэрвеня 1962 г. даплату да закупачных і здатачных цэн у размеры 15 працэнтаў.

Павысіць з 1 чэрвеня 1962 года дзеючыя закупачныя цэны на прадаваемыя дзяржаве калгасамі масла ў сярэднім на 10 працэнтаў і смятанку на 5 працэнтаў.

Устанавіць здатачныя цэны на буйную рагатую жывёлу, свіней, трусоў і птушку, здаваемыя дзяржаве саўгасамі і іншымі дзяржаўнымі сельскагаспадарчымі прадпрыемствамі і арганізацыямі, на 10 працэнтаў ніжэй за закупачныя цэны, зацверджаныя гэтай пастановай.

Абавязаць Саветы Міністраў саюзных рэспублік, выходзячы з зацверджаных гэтай пастановай закупачных і здатачных цэн, распрацаваць і прадставіць у тыднёвы тэрмін у Савет Міністраў СССР на зацвярджанне закупачныя (здатачныя) цэны на жывёлу і птушку па зонах і сезонах нарыхтовак, а на буйную рагатую жывёлу таксама па ўкормленасці.

Устанавіць, што жывёла, птушка, масла і смятанка, прадаваемыя дзяржаве гаспадаркамі калгаснікаў, рабочых і служачых, аплачваюцца па цэнах, устаноўленых згодна з гэтай пастановай на адпаведную прадукцыю для калгасаў.

З мэтай скарачэння страт, якія нясе дзяржава пры продажы насельніцтву мяса, мясапрадуктаў і масла, а таксама ўстанаўлення больш правільных суадносін паміж закупачнымі і рознічнымі цэнамі на прадукцыю жывёлагадоўлі павысіць з 1 чэрвеня 1962 г. рознічныя цэны на мяса і мясныя прадукты ў сярэднім на 30 працэнтаў, у тым ліку на ялавічыну ў сярэднім на 31 працэнт, бараніну — на 34 працэнты, свініну — на 19 працэнтаў і на каўбасныя вырабы — на 31 працэнт, а таксама на масла ў сярэднім на 25 працэнтаў.

* * *

Савет Міністраў СССР лічыць, што павышэнне закупачных і здатачных цэн на прадукцыю жывёлагадоўлі з'яўляецца вялікай фінансавай дапамогай калгасам і саўгасам. Саветы Міністраў саюзных і аўтаномных рэспублік, крайвыканкомы, аблвыканкомы, тэрытарыяльныя вытворчыя калгасна-саўгасныя (саўгасна-калгасныя) упраўленні, калгасы і саўгасы, выкарыстоўваючы гэту дапамогу, павінны ўжо ў гэтым годзе дабіцца рэзкага павелічэння вытворчасці мяса і іншых прадуктаў жывёлагадоўлі, павышэння прадукцыйнасці працы і зніжэння сабекошту прадукцыі з тым, каб вытворчасць прадуктаў жывёлагадоўлі ў кожным калгасе і саўгасе была рэнтабельнай.

У САВЕЦЕ МІНІСТРАЎ СССР

АБ ЗНІЖЭННІ ДЗЯРЖАЎНЫХ РОЗНІЧНЫХ ЦЭН НА ЦУКАР, ТКАНІНЫ З ВІСКОЗНАЙ ШТАПЕЛЬНАЙ ПРАЖЫ І ВЫРАБЫ З ГЭТЫХ ТКАНІН

Савет Міністраў Саюза ССР пастанавіў:

Знізіць з 1 чэрвеня 1962 года дзяржаўныя рознічныя цэны на наступныя тавары народнага ўжытку:

на цукар — у сярэднім на 5 працэнтаў

на тканіны з віскознай штапельнай пражы — у сярэднім на 20 працэнтаў.

Даручыць Саветам Міністраў саюзных рэспублік знізіць з 1 чэрвеня 1962 года рознічныя цэны на швейныя, галантарэйныя і іншыя вырабы з віскозных штапельных тканін у размеры, адпавядаючым зніжэнню рознічных цэн на гэтыя тканіны.

ДА 80-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

ЛЮБОЎ АРЛЯНЯТ

АДНА з асаблівасцей твораў класікаў у тым, што яны заваладваюць тваёю свядомасцю, тваімі думкамі і пачуццямі яшчэ ў пару дзяцінства, у школьныя гады. Паэзія Купалы была для нас надзённым духоўным хлебам. На ёй мы вучыліся беларускай літаратурнай мове, яна афармляла нашы эстэтычныя паняцці, памагала станаўленню нашага светапогляду.

Як і славуты верш «А хто там ідзе?»,—паэтычнае абагульненне імкненняў прыгнечанага народа да лепшай будучыні,— верш «Арлянятам» стаў знамянальным творам. З'явіўшыся своечасова, ён прагучаў, як гарачы заклік да савецкай моладзі будаваць на руінах мінулага новы свет, любіць новае і тварыць у імя яго. Магутны талент Купалы ўвасобіў у сардэчных словах, смелых вобразах дух часу, ідэі, народжаныя савецкай рэчаіснасцю, настрой мільёнаў маладых будаўнікоў сацыялізма. Вобраз купалаўскіх арлянят праносіш праз усё жыццё разам з іншымі яго незабыўнымі вобразамі.

Янку Купалу я ведаў у канцы 20-х — пачатку 30-х гадоў, у пару свайго студэнцтва. У дваццаць гадоў не думаюць пра мемуары і не робяць запісаў аб сустрэчах. Я бачыў Купалу на літаратурных вечарах і дыспутах, сустракаўся з ім у Доме пісьменніка. Ён быў і застаецца для нас патрыярхам беларускай паэзіі. Глыбокай павагай акружалі мы яго, і кожнаму хацелася зрабіць яму што-небудзь добрае і прыемнае, зберагчы яго, жывое ўвасабленне беларускай класічнай літаратуры, назаўжды. Студэнтамі-практыкантамі Белпедтэхнікума мы хадзілі ў дзіцячы сад і бачылі дарагую і простую Уладзіславу Францаўну — верную спадарожніцу і друга паэта—у ролі чулай выхавацелькі дзяцей.

У ПАЧАТКУ 30-х гадоў камсамол Беларусі аддаваў шмат увагі пытанням літаратуры і выхавання літаратурнай моладзі. Увосень 1931 года пастановай Мінскага гаркома ЛКСМБ пры Доме пісьменніка была створана камсамольская ячэйка, мяне выбралі яе адказным сакратаром. Рабіліся пошукі форм работы з маладымі літаратарамі, ствараліся так званыя «творчыя групы». У сакавіку 1932 года аформілася і творчая група камсамольскіх пісьменнікаў (Б. Мікуліч, М. Блісцінаў, Т. Хадкевіч, я і іншыя).

Вясной таго ж года па ініцыятыве ЦК ЛКСМБ на Беларусі праводзіўся агляд маладзёжнай літаратуры. Мелася на ўвазе падвесці вынікі дасягненняў беларускай савецкай літаратуры ў справе адлюстравання ўдзелу моладзі ў сацыялістычным будаўніцтве і мабілізаваць пісьменнікаў на стварэнне новых кніг аб моладзі і камсамоле. Праблема ставілася шырока: у паняцце «маладзёжная літаратура» ўключаліся і творы аб моладзі, напісаныя пісьменнікамі старэйшага пакалення, і творчасць маладых. Камсамольскі друк на працягу некалькіх месяцаў асвятляў ход агляду, былі праведзены дзесяткі літаратурных вечароў і сустрэч пісьменнікаў з чытачамі. У аглядзе маладзёжнай літаратуры прыняў удзел і Янка Купала.

19 мая 1932 года бюро ЦК ЛКСМБ прыняло пастанову аб ходзе агляду маладзёжнай літаратуры і зацвердзіла склад яго штаба, а 22 мая брыгада пісьменнікаў ужо накіроўвалася поездам на тры дні ў Барысаў. Янка Купала быў цэнтральнай фігурай нашай брыгады, чым мы, маладыя, вельмі ганарыліся. У склад брыгады яшчэ ўваходзілі празаік Сымон Баранавых, паэт Уладзімір Хадыка, крытык Алесь Кучар, яўрэйскі паэт-камсамолец М. Гарцман і я. У першы дзень нашага знаходжання ў Барысаве мы правялі агульна-гарадскі літаратурны вечар. Назаўтра, 23 мая, адбылося ўрачыстае пашыранае пасяджэнне бюро Барысаўскага райкома ЛКСМБ з удзелам камсамольскага актыву горада. На гэтым пасяджэнні мне было даручана зрабіць даклад аб вобразе камсамольца ў беларускай літаратуры. Затым пісьменнікі чыталі свае творы.

Янка Купала... Да вобраза народнага песняра не раз звярталіся скульптары і мастакі Беларусі. Прыцягнуў ён увагу і майстроў-шклавараў завода «Нёман». Тут створана юбілейная ваза з партрэтам Янкі Купалы. Адна з лепшых работніц камсамолка Ніна Іванюк аздабляе вазы золатам.

Фота М. МІНКОВІЧА.

Выступленне Янкі Купалы на пасяджэнні камсамольскага райкома было сустрэта бурнымі авацыямі, якім, здавалася, не будзе канца. Арляняты, якіх народны паэт заклікаў да барацьбы, да працы, да подзвігаў, ад усяго сэрца выказвалі паэту сваю любоў, сваё захапленне.

Свежым майскім ранкам (24 мая) мы ездзілі за горад, у сельскагаспадарчы тэхнікум, на сустрэчу са студэнтамі. І там паўтарылася тое ж самае: моладзь шчыра вітала народнага паэта.

Выступленні Купалы перад масавай аўдыторыяй (ён аддаваў перавагу сваім новым творам, такім, як «Зыходзіш, вёска, з яснай явы», «А ў Вісле плавае тапелец» і г. д.) я слухаў не аднойчы і да Барысава і пасля Барысава, але самыя вострыя ўражанні засталіся ад сустрэчы Купалы з барысаўскай моладдзю. Успаміны аб гэтых сустрэчах не сцёрліся праз доўгія гады, і менавіта яны адлажыліся ў вершаваных радках:

Мне бязмежная радасць
видома —
Назаўжды яна ў сэрца запала:
Як народу свайму маладому,
Помню, вершы чытаў Купала.

У 1932 годзе святкавалася пяцідзесяцігоддзе Янкі Купалы, і мне выпаў гонар вітаць на ўрачыстым вечары народнага паэта ад камсамольскай арганізацыі пісьменнікаў. На старонках газеты «Літаратура і мастацтва» (№ 17 за 10 верасня 1932 г.) творчая група камсамольскіх пісьменнікаў выступіла з гарачым прывітаннем Янку Купалу.

ТРАГІЧНАЯ вестка пра смерць Янкі Купалы напаткала мяне ўжо ў Ташкенце. Гэта была для мяне і цяжкай асабістай стратай, вялікім горам. Трэба было штосьці такое сказаць, каб неяк асэнсаваць трагічную падзею, даць выхад пачуццям. Так з'явілася задума верша памяці вялікага Купалы.

Праз год эвакуіраваная ў Ташкент Беларуская акадэмія навук, Саюз пісьменнікаў Узбекістана і філалагічны факультэт Сярэднеазіяцкага універсітэта распачалі падрыхтоўку да пасяджэння, прысвечанага першай гадавіне смерці Купалы. Якуб Колас прапанаваў мне прыняць удзел у гэтым пасяджэнні, якое адбылося 27 чэрвеня 1943 года, у будынку універсітэта. Старшынёю быў Якуб Колас. Вучоныя-літаратуразнаўцы Н. Піксанаў, Л. Баўдзей, Ул. Агіевіч, Л. Фіглоўская зрабілі даклады аб творчасці Я. Купалы, паэты С. Гарадзецкі, М. Тарэшчанка, Э. Агняцвет, Л. Кацовіч чыталі вершы на розных мовах. Я выступіў з вершам «Светлай памяці Янкі Купалы». Вялікая Айчынная вайна была ў разгары, наша армія пачала фарсіраваць Дняпро, і вобраз купалаўскіх арлянят натуральна асацыіраваўся ў мяне з вобразам савецкіх воінаў, якія вызвалялі заходнія раёны нашай радзімы ад фашысцкай навалы.

Сцяпан ЛІХАДЗІЕЎСКІ.
г. Ташкент.

КУПАЛАЎСКІ ВЕЧАР

Днямі ў памяшканні інстытута механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі адбыўся вялікі літаратурны вечар, прысвечаны 80-годдзю з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Янкі Купалы.

Вечар адкрыла дырэктар кінатэатра «Зорка» О. Зарудная. Уступнае слова сказаў супрацоўнік Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы Ю. Гаўрук. Аб драматургіі Я. Купалы і яе сцэнічнай гісторыі расказаў кандыдат мастацтвазнаўства А. Сабалеўскі. З успамінамі выступіла, горача сустрэтая прысутнымі, сястра паэта Л. Д. Раманоўская. М. Аўрамчык, Ю. Свірка і А. Ставер прачыталі вершы, прысвечаныя паэту.

Удзельнікам вечара быў паказан першы акт камедыі «Паўлінка» ў пастаноўцы Тэатра імя Я. Купалы. Ролі выконвалі народныя артысты БССР Ул. Дзядзюшка і В. Пола, народныя артысты СССР Л. Ржэцкая і Г. Глебаў, артыст Ул. Кудрэвіч і артыстка Б. Дакальская.

Вечар, арганізаваны саветам клуба прыхільнікаў мастацтва і літаратуры пры кінатэатры «Зорка» і камітэтам камсамола інстытута, прайшоў з вялікім поспехам.

Л. ВАНКОВІЧ.

ЗВАРОТ

ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР

ДА ЎСІХ РАБОЧЫХ І РАБОТНІЦ, КАЛГАСНІКАЎ І КАЛГАСНІЦ, РАБОЧЫХ І РАБОТНІЦ САЎГАСАЎ, САВЕЦКАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ, ДА ЎСЯГО САВЕЦКАГА НАРОДА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

калгасаў, каб яна давала ім неабходныя накапленні, матэрыяльна зацікаўлівала іх у хуткім павелічэнні вытворчасці прадуктаў жывёлагадоўлі. Але для гэтага спатрэбяцца вялізарныя сродкі. Паўстае пытанне, адкуль узяць іх?

Магчыма, трэба пайсці на тое, каб зменшыць сумы даходаў, якія размяркоўваюцца ў калгасах па працы? Не, гэта мера прывяла б да зніжэння матэрыяльнай зацікаўленасці калгаснікаў і падарвала б эканамічныя асновы калгаснай вытворчасці. Яна, значыць, прынесла б не карысць, а шкоду. Яна не стымулявала б, а, наадварот, скоўвала б развіццё жывёлагадоўлі.

Магчыма, у імя хутчэйшага ўздыму вытворчасці мяса і малака трэба было б пераключыць сюды сродкі ў шкоду ўмацаванню абароназдольнасці і развіццю прамысловасці? Вядома, усе савецкія людзі разумеюць, што нельга стаць на гэты шлях.

Мы жывём не ў беспаветранай прасторы. Пакуль існуе імперыялізм, захоўваецца і небяспека новых войнаў. Не сакрэт, што міжнародная рэакцыя на чале з ЗША цяпер узмоцнена бразгае зброяй, вядзе ліхаманкавую гонку ўзбраеняў і выношвае планы раптоўнага ракетна-ядзернага нападу на СССР і іншыя сацыялістычныя краіны; яе палітыкі і генералы гавораць аб гэтым адкрыта. Больш таго, аб гэтым адкрыта сказаў прэзідэнт Злучаных Штатаў Амерыкі пан Д. Кенедзі. Ён заявіў: «Пры некаторых акалічнасцях, мы, магчыма, правявім ініцыятыву ў ядзерным канфлікце з Савецкім Саюзам».

Такім чынам, міжнародная абстаноўка, якая склалася, настойліва патрабуе, каб Савецкі Саюз, усе краіны сусветнай сацыялістычнай сістэмы заўсёды былі гатовы даць сакрушальны адпор любому агрэсару. А, як вядома, умацаванне абароназдольнасці не абыходзіцца без вялікіх расходаў, без вялікіх затрат. Але іншага выйсця, на жаль, няма. Імперыялісты прывыклі паважаць толькі сілу, і, калі яны да гэтага часу не пачалі вайну, то толькі таму, што ведаюць нашу эканамічную і ваенную магутнасць, ведаюць, што Савецкая краіна мае цяпер усё неабходнае, каб ахаладзіць ваяўнічы запал любых агрэсараў.

Магчыма, можна пераключыць частку сродкаў у сельскую гаспадарку за кошт скарачэння ўкладання ў металургічную, хімічную, машынабудаўнічую і іншыя галіны прамысловасці? Нельга пайсці і па гэтым шляху. Гэта прывяло б да падрыву эканамічнай базы ўсёй народнай гаспадаркі, у тым ліку і сельскай гаспадаркі.

Дзяржава асігноўвае вялізарныя сродкі на жыллёвае будаўніцтва, на развіццё сеткі медыцынскіх устаноў, школ. Толькі за апошнія чатыры гады 50 мільёнаў савецкіх грамадзян, гэта значыць амаль чвэрць насельніцтва краіны, справілі наваселле. Магчыма, можна адшукаць некаторыя сродкі за кошт скарачэння жыллёвага будаўніцтва? Савецкія людзі разумеюць, што нельга пайсці і па гэтым шляху.

Значыць, необходнасць павышэння закупачных цэн іменна ў інтарэсах хуткага росту вытворчасці прадуктаў жывёлагадоўлі відавочная. Адсюль вынікае необходнасць павышэння і рознічных цэн на мяса, мясныя прадукты і масла.

У некаторай частцы насельніцтва можа ўзнікнуць пытанне, а ці нельга, павысіўшы закупачныя цэны на мяса, захаваць цяпер існуючыя рознічныя цэны на мяса і мясныя прадукты? Калі нават дапусціць, што дзяржава знайшла б дадатковыя сродкі на гэтыя мэты за кошт павышэння цэн, напрыклад, на гарэлку, тытунь і некаторыя іншыя вырабы, то і ў гэтым выпадку нельга, павысіўшы закупачныя цэны, пакінуць на ранейшым узроўні рознічныя цэны. Пры недахопе мяса гэта стварыла б глебу для спекуляцыі і яшчэ больш ускладніла б вырашэнне задачы бесперабойнага забеспячэння гарадоў прадуктамі жывёлагадоўлі.

У цяперашні час, пры недахваце мяса, насельніцтва вымушана пераплачваць значныя сумы асобам, якія, карыстаючыся цяжкасцямі з вытворчасцю мяса, спекулююць на гэтым і наживаюць вялікія грошы. Калі мы павысім закупачныя цэны, то будуць створаны лепшыя магчымасці для росту прадукцыйнасці працы ў калгасах. На гэтай аснове павялічыцца вытворчасць прадуктаў жывёлагадоўлі і ў далейшым патрэбы насельніцтва ў мясе будуць поўнасцю задавальняцца праз гандлёвую сетку па больш танных цэнах. Таму павышэнне цэн на мяса, на якое мы часова ідзём, акупіцца, дасць свае выгады насельніцтву.

Улічваючы ўсё гэта, ЦК КПСС і Савет Міністраў СССР вырашылі павысіць закупачныя цэны на мяса буйной рагатай жывёлы, свіней, авечак, коз і птушку ў сярэднім на 35 працэнтаў. Адначасова вырашана павысіць рознічныя цэны на мяса і мясныя прадукты ў сярэднім на 30 працэнтаў, а таксама на масла ў сярэднім на 25 працэнтаў.

Цэнтральны Камітэт партыі і Савецкі ўрад усведамляюць, што само па сабе павышэнне цэн — мера непажаданая. Партыя разумее, што павышэнне цэн на мяса, мясныя прадукты і масла з'явіцца пэўным выдаткам, крыху зменшыць магчымасці насельніцтва купляць гэтыя прадукты, адаб'ецца на бюджэце сям'і.

Ідучы на павышэнне закупачных і рознічных цэн на мяса, мясныя прадукты і масла, Цэнтральны Камітэт партыі і Савецкі ўрад думалі аб тым, каб, наколькі гэта магчыма, зменшыць выдаткі насельніцтва, выкліканыя павышэннем рознічных цэн. З гэтай мэтай зніжаны рознічныя цэны на цукар, а таксама на штапельныя тканіны і вырабы з гэтых тканін. Мільёны людзей карыстаюцца ў нас грамадскім харчаваннем. Улічваючы гэта, адпускныя цэны на мясныя стравы прызнана мэтазгодным павысіць у нязначных размерах.

Павышэнне закупачных і рознічных цэн мера необходная. Яна дазволіць калгасам зрабіць дадатковыя расходы на механізацыю работ ў жывёлагадоўлі, будаўніцтва памяшканняў, на павелічэнне вытворчасці кармоў, а, значыць, і павялічыць вытворчасць мяса і малака. У той жа час яна паслужыць справе ўмацавання матэрыяльнай зацікаўленасці калгасаў і калгаснікаў у выніках сваёй працы. Гэта мера будзе садзейнічаць хуткаму павелічэнню вытворчасці прадуктаў жывёлагадоўлі, ад чаго, у канчатковым выніку, выйграе ўвесь савецкі народ.

Акрамя таго, трэба сказаць, што ў цяперашні час цэны на мяса і масла ў параўнанні з некаторымі іншымі прадуктамі харчавання адносна заніжаны. Здарылася гэта ў значнай меры таму, што цэны на мяса і масла ў свой час без дастатковых эканамічных абгрунтаванняў былі зніжаны ў большай ступені, чым на такія прадукты харчавання, як, напрыклад, алей, цукар, бульба. У цяперашні час цэны на мяса ў нашай краіне значна ніжэйшыя, чым у радзе капіталістычных краін, якія вызначаюцца высакаразвітай сельскай гаспадаркай.

Зразумела, гэта было б вельмі добра, калі б больш нізкія рознічныя цэны вынікалі ў нашай краіне з больш высокай прадукцыйнасці працы ў сельскай гаспадарцы. Вядома, аднак, што ўзровень прадукцыйнасці працы ў сельскай гаспадарцы СССР пакуль яшчэ, на жаль, ніжэйшы, чым у некаторых капіталістычных краінах з развітай сельскай гаспадаркай.

У гэтых умовах больш нізкія рознічныя цэны на мяса, мясныя прадукты, масла толькі дэзарганізуюць вытворчасць. Сапраўды, хіба можна прызнаць нармальным, што дзяржава прадае прадукты жывёлагадоўлі са значнай стратай? Так, у мінулым годзе затраты дзяржавы на закупку, перапрацоўку і гандаль у разліку на цэнтнер ялавічыны (у забойнай вазе) складалі 138,6 рубля, а рознічная цана за цэнтнер ялавічыны ў сярэднім за ўсе гатункі — 110,8 рубля. Усе затраты дзяржавы на цэнтнер свініны (у забойнай вазе) былі роўны 167,2 рубля, а рознічная цана за цэнтнер у сярэднім за ўсе гатункі — 155,6 рубля. Масла таксама каштуе дзяржаве даражэй за рознічныя цэны на яго.

Калі падлічыць гэта на ўвесь аб'ём гандлю, то няцяжка пераканацца, што дзяржава церпіць страты ад гандлю прадуктамі жывёлагадоўлі на многія сотні мільёнаў рублёў. Таму трэба ўнесці необходныя папраўкі ў закупачныя і рознічныя цэны на мяса і тым самым стварыць больш спрыяльныя ўмовы для павелічэння вытворчасці жывёлагадоўчых прадуктаў.

Дарагія таварышы!

Цэнтральны Камітэт партыі і Савет Міністраў СССР выказваюць цвёрдую ўпэўненасць, што рабочыя і работніцы, калгаснікі і калгасніцы, савецкая інтэлігенцыя, усе савецкія людзі правільна зразумеюць эканамічную і палітычную необходнасць такой меры дапамогі сельскай гаспадарцы, як павышэнне закупачных цэн і адпаведна рознічных цэн на прадукты жывёлагадоўлі, і зробяць усё магчымае, каб хутчэй стварыць поўны дастатак у краіне сельскагаспадарчых прадуктаў.

Нельга ўяўляць справу так, быццам рух да камунізма адбываецца без пераадолення цяжкасцей. Будаўніцтва новага жыцця — не слізганне па паркеце, дзе няма ні сучка, ні задзірынкі.

Ажыццяўленне вялікіх планаў камуністычнага будаўніцтва выклікае і некаторыя цяжкасці. Але цяперашнія цяжкасці пераадолець значна лягчэй, чым тыя, якія былі ў нас у мінулым.

У сваім сацыяльным развіцці мы дасягнулі вялікіх вышынь. Аднак было б памылкай, маючы сур'ёзныя дасягненні ў развіцці народнай гаспадаркі, аддавацца бестурботнасці, заспакоенасці і зазнайству.

Партыя і ўрад яшчэ і яшчэ раз звяртаюць увагу савецкіх людзей на тое, што ўздым сельскай гаспадаркі — кроўная справа ўсёй партыі, усяго народа.

У нашай краіне ўжо цяпер нямала саўгасаў і калгасаў, у якіх сабекошт мяса і малака значна ніжэйшы, чым закупачныя цэны. І няма сумнення, што ў самы бліжэйшы час усе калгасы і саўгасы зробяць вялікі крок наперад у вытворчасці мяса, малака, узнімуць прадукцыйнасць працы, рэзка знізяць затраты на вытворчасць прадуктаў. А калі прадуктаў будзе многа, калі на іх вытворчасць будуць няспынна зніжацца затраты працы, тады можна будзе зменшыць закупачныя цэны і адначасова зніжаць рознічныя цэны.

XXII з'езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза прыняў новую Праграму КПСС. У ёй пастаўлены выключна адказныя задачы ў галіне далейшага развіцця сельскай гаспадаркі. Цяпер, пасля сакавіцкага Пленума ЦК КПСС, калгасы і саўгасы прымаюць дзейсныя меры да таго, каб рашуча ўзняць вытворчасць прадуктаў жывёлагадоўлі. З гэтай мэтай у бягучым годзе значна расшыраюцца пасевы кукурузы, цукровых буракоў, гароху, кармавога бобу і іншых культур. Цяпер неабходна праявіць клопаты аб тым, каб вырасціць высокі ўраджай збожжа, кукурузы, цукровых буракоў, гароху, бобу. Тады калгасы і саўгасы будуць мець дастатак кармоў, будуць хутка нарошчваць вытворчасць прадуктаў жывёлагадоўлі.

Дарагія таварышы! Некаторае павышэнне цэн на мяса і мясныя прадукты, а таксама на масла—гэта мера часовая. Партыя ўпэўнена, што савецкі народ паспяхова ажыццёвіць меры, намечаныя сакавіцкім Пленумам ЦК КПСС у галіне сельскай гаспадаркі. Узнімецца ўзровень механізацыі, павысіцца прадукцыйнасць працы, знізіцца сабекошт атрымліваемай прадукцыі, што дасць магчымасць у недалёкай будучыні зніжаць цэны на прадукты сельскай гаспадаркі.

Цэнтральны Камітэт КПСС і Савецкі ўрад упэўнены, што савецкія людзі правільна зразумеюць пытанні, узнятыя ў гэтым звароце, прыкладуць усе сілы для таго, каб хутчэй ажыццявіць вялікія планы камуністычнага будаўніцтва.

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ КПСС
САВЕТ МІНІСТРАЎ СССР

ТЭАТР

ПАД АДНЫМ НЕБАМ

Я. РАМАНОВІЧ

Новая п'еса Аркадзя Маўзона «Пад адным небам», пастаўленая Рускім тэатрам імя М. Горкага (рэжысёр Я. Яраў), паказвае жыццё нашых сучаснікаў, узнімае вострыя праблемы савецкага грамадства. У ёй багата аўтарскага роздуму, і, нягледзячы на пэўныя літаратурныя штампы, можна сказаць, што А. Маўзон як драматург зрабіў на гэты раз значны крок наперад.

Спектакль «Пад адным небам» перасцерагае: беражыцеся такіх, як бацька і сын Мякішавы. Гэта знешне прыемныя людзі, аднак у іх вельмі подлае нутро, лжывая душа. Часам здольныя і энергічныя, яны маглі б стварыць многа каштоўнага для грамадства, але ўсе іх жаданні і намеры накіраваны на задавальненне ўласных індывідуалістычных патрэб. Яны хочуць жыць за чужы кошт, стварыць свой дабрабыт і шчасце, топчучы душы і пачуцці іншых людзей. Дарэчы, самі яны перакананы ў тым, што нічога такога дрэннага, антыграмадскага не робяць. Яны, маўляў, сумленна працуюць, і нават «сумленна» гаворыць на развітанне падманутай жанчыне, што свабода пачуццяў—аснова камуністычнага жыцця і нельга прымушаць чалавека жыць насуперак сваіх жаданняў.

Мякішавы стараюцца замаскіраваць сваю жыццёвую філасофію, іх адразу не распазнаеш. Аднак падман, які б ён ні быў прыгожы, ёсць падман, і рана ці позна будзе выкрыты. І Вера, і Аляксей, і нават экзальтаваная Маша паступова разглядзелі Барыса Мякішава і пагналі яго ад сябе. Ды мякішавы застаюцца ў жыцці, і іх трэба асцерагацца. З імі трэба весці барацьбу. У гэтым—асноўны ідэйны змест спектакля, яго выхаваўчае значэнне, асабліва для моладзі.

У спектаклі дзейнічаюць жывыя прывабныя людзі са шчырымі пачуццямі і думкамі. Вера—даверлівая, нават часам наіўная. Яна ў палоне сваіх першых пачуццяў. Аляксей — смелы, сумленны, чулы і ўважлівы чалавек. Ён выратаваў жыццё Машы, калі тая трапіла ў вір, дапамог уладкавацца на работу шалапуту Барысу, прытуліў бяздомную Веру. Праўда, іншы раз Аляксей бывае вельмі ўжо звычайным, занадта сцёплым. У ім нестае таго жыццярадаснага самаадчування, рамантычнай узнёсласці, гумару, якія робяць чалавека прыгожым і цікавым. Яму, як і Веры, не хапае інтэлектуальнасці.

Мне думаецца, што ў вывучэнні характару нашага сучасніка, у паказе яго станоўчых і высвятленні, выкрыцці адмоўных рыс і лжыцьць прырода сучаснага драматургічнага канфлікту.

Ідучы ад вызначэння М. Горкага, што асновай драматургіі з'яўляецца раскрыццё характару чалавека ў дзеянні, А. Маўзон і тэатр знайшлі правільны шлях, каб стварыць цікавы спектакль аб нашых сучасніках. Ён вабіць да сябе не толькі сюжэтам, у якім знойдзена многа новага, але і дзеючымі асобамі, сцэнічнымі вобразамі. А галоўнае — гэта на дзіва сучасны твор. Тут трэба прызнаць вялікую заслугу рэжысёра Я. Ярава.

Аб сцэнічным увасабленні п'есы можна сказаць шмат добрых слоў. На сцэне дзейнічае моцны і дружны ансамбль выканаўцаў, якія добра ведаюць свае задачы, тонка адчуваюць партнёра і жывуць у вобразах сапраўдным жыццём.

Можна спрачацца аб стылі спектакля, аб вырашэнні асобных сцэн і сродках дэкарацыйнага афармлення (мастак В. Кляшчэўскі), але нельга не прызнаць таго, што як агульная кампазіцыя, так і каларыт у пастаноўцы вельмі трапныя.

Ролю Барыса Мякішава выконвае Р. Янкоўскі. Наш глядач добра ведае гэтага артыста па многіх цікавых вобразах, створаных ім у розных спектаклях Рускага тэатра. Прыемна адзначыць прыкметны рост сцэнічнага майстэрства маладога выканаўцы, псіхалагічна тонкае і глыбокае раскрыццё ім душэўнага свету свайго героя. Успомніце, як Барыс з'яўляецца ў доме Траяна, як стараецца зрабіць «ўражанне» на даверлівую Машу, як паводзіць сябе ў часе раптоўнай вечарынкі. Адразу адчуваецца, што такі чалавек лёгка з'арыентуецца ў любых абставінах. Ён адразу бярэ ініцыятыву ў свае рукі і арганізуе гулянку: нахаду ловіць усе жаданні Машы і тут жа іх здзяйсняе—музыцыруе, пачынае танцы, гаворыць прыгожыя тосты. Спрытны кавалер, зачароўвае ўсіх, нават суровага Траяна. Але вось вы бачыце, як Барыс Мякішаў пасля вечарынкі сустракаецца з закаханай у яго Верай, якая яго доўга чакала і змокла пад дажджом. І хоць Барыс пяшчотна туліць яе да сябе і накрывае пінжаком, вы адчуваеце, што гэта фальшыва, бо вочы прайдзісвета выкрываюць яго ўнутраную разгубленасць. Аднак вы ўсё ж пачынаеце сумнявацца,—няўжо ён хлусіць Веры, такой шчырай, цудоўнай дзяўчыне. Ды не, відаць там, на вечарынцы ў Траяна Барыс быў проста вясёлым хлопцам, прыгожым юнаком і «душой кампаніі». З ім не сумна, ён можа нават дазволіць сякія-такія лёгкія заляцанні, але падмануць каго, —не, таго не можа быць! Аднак—Вера цяжарная, бо даверылася такому прывабнаму юнаку. І выяўляецца, што прывабнасць яго—толькі вонкавая.

— Як жа я далей буду сустракацца з Машай? — думае Барыс Мякішаў.—А самае галоўнае, як жа я ўвайду ў дом Траяна, гэтай высокай асобы, дзе лёгка можна авалодаць даверлівай дзяўчынай, здабыць бестурботнае існаванне і нават зрабіць службовую кар'еру? Няўжо ўсе гэтыя, зусім рэальныя мары гінуць толькі ад таго, што нейкая нікчэмная, неспрактыкаваная дзяўчынка раптам дазволіла сабе заця жарыць. Жах! Катастрофа! Правал!

Чалавек не нараджаецца нягоднікам, яго можа зрабіць такім уласная сям'я альбо людзі, з якімі ён сябруе. У Барыса нядобрасумленны бацька—эгаіст, кар'ерыст і баязлівец. Ён не раз хлусіў у сваім жыцці, часта рабіў несумленныя ўчынкі і жыў пераважна для задавальнення сваіх жаданняў. Сын добра засвоіў гэтыя бацькоўскія рысы.

Артыст Р. Янкоўскі валодае сакрэтам акцёрскага майстэрства — раскрыць душу свайго персанажа так, каб мы бачылі ў ёй у сто разоў больш за тое, што гаворыцца словамі. Я ўжо не кажу пра тое, што ён іграе «лёгка», без усялякага напружання.

У спектаклі многа акцёрскіх здабыткаў.

Сур'ёзная работа Р. Качаткова—вобраз Траяна. Траян як чалавек вялікага жыццёвага і партыйнага вопыту выкрывае ў Барысу Мякішаве нягодніка і стрымлівае сваю дачку Машу ад небяспечнага кроку ў яе жыцці — жаніцьбы з Барысам. Робіць ён гэта вельмі тактоўна, але рашуча, а ў канцы нават рэзка і непрымірыма, як і належыць чалавеку яго складу. Гэтыя якасці Траяна вельмі моцна і выразна даносіць да гледача Р. Качаткоў. Акцёра можна папракнуць хіба што ў некаторай сухасці і рэзкасці паводзін. Зусім зразумела, калі гэтая рэзкасць праяўляецца ў дачыненні да бацькі Барыса Мякішава. Траяну ёсць за што не паважаць гэтага чалавека. Але ж у адносінах з дачкою, відаць, патрэбна не толькі душэўная цеплыня, але і некаторыя знешнія не праявы. Ва ўсім астатнім Траян у выкананні Р. Качаткова ўяўляецца нам фігурай моцнай і прывабнай. Сцэна выкрыцця ім Барыса Мякішава—адна з самых яркіх у спектаклі. Яна дасягае сапраўднага драматызму.

Артыст І. Ражба дакладна малюе вобраз бацькі Барыса Мякішава — гэткага сучаснага эпікурэйца, чалавека эгаістычнага і хцівага, тыповага кар'ерыста і камбінатара, гатовага на любую подласць дзеля забеспячэння сваіх абываццельскіх патрэб. Ён паводзіць сябе знешне зусім прыстойна і стрымана, але мы выразна бачым, чым напоўнена яго душа.

Прыемна адзначыць сцэнічны рост маладой актрысы Л. Былінскай у ролі Машы. Створаны ёю вобраз праўдзівы і тонкі. Маша кінулася да Барыса, як матылёк да агню, але не паспела абпаліць свае крылы, бо бацька своечасова адхіліў небяспеку.

Добрае ўражанне пакідае З. Асмалоўская, якая выконвае ролю Людмілы. Гэтая жыццярадасная дзяўчына мае чулую душу, ясны розум і чыстае сумленне. Людміла верны друг, які ніколі не падвядзе ні ў радасці, ні ў бядзе.

Складаная задача ў гэтым спектаклі выпала на долю маладой артысткі Б. Масумян, якая выконвае ролю Веры. Гэты вобраз у яе выкананні вабіць шчырасцю, жыццёвай прастатой, дакладнасцю паводзін, поўнай адсутнасцю ўсякага найгрышу і меладраматызму, хаця на іх лёгка было збіцца. Артыстка вельмі прывабная і арганічна ўваходзіць у спектакль.

На жаль, драматургічны матэрыял вобраза не заўсёды дакладны. Я маю на ўвазе апошнюю сцэну, якая з пункту гледжання кампазіцыі п'есы і завяршэння яе сюжэта наўрад ці патрэбна ў спектаклі,—усё ясна і без таго. Тут паказаны ўзаемаадносіны Веры з Аляксеем. Ёсць спроба зазірнуць у іх будучыню. Але ж усё гэта гледачу зразумела і так, без лішніх каментарыяў і падказак.

Аляксея іграе Ю. Сцяпанаў. Я асабіста не магу пагадзіцца з гэтым вобразам. Але мае прэтэнзіі накіраваны тут больш да аўтара і рэжысёра, чым да здольнага маладога акцёра. Вобраз Аляксея не задавальняе мяне таму, што вельмі ўжо нагадвае многія падобныя вобразы з літаратуры мінулага, у ім мала сучасных рыс.

Паказваючы дабрату душы Аляксея, аўтары п'есы і спектакля надзялілі яго многімі якасцямі, ад якіх часам патыхае гэткай хрысціянскай добразычлівасцю, а не савецкім гуманізмам. Аляксей пусціў Веру да сябе ў пакой, бо тую выгналі з прыватнай кватэры нібыта за разбэшчанасць. Ды жывуць у адным пакоі, але іх адносіны здаюцца абсалютна фальшывымі, пазбаўленымі псіхалагічнай праўды. Аляксей хутчэй падобны тут на кандыдата ў баптысты.

Акцёр можа сказаць — чаго ны ад мяне хочаце, так жа напісаў аўтар, што я магу зрабіць. Але ж аўтар ходзіць сярод нас, ён часта быў у тэатры, калі ставілася п'еса. Значыць, трэба было з ім паспрачацца, пераканаўча давесці яму пэўны фальш гэтага вобраза, запатрабаваць дапрацоўкі яго. Акцёр можа вельмі дапамагчы аўтару, бо ён такі ж творца, як і пісьменнік, і часам не менш за яго ведае жыццё.

Я не сказаў яшчэ аб адным персанажы — аб Аграфене Спірыдонаўне (Т. Кудраўцава). Не сказаў таму, што гэты вобраз занадта ўжо чужародны і па сваёй мове і па сваіх паводзінах, — нібыта зусім не з гэтай п'есы.

Мне б хацелася закончыць свае развагі аб новым спектаклі невялічкім вывадам. Там, дзе нашы драматургі па-сапраўднаму думаюць над жыццём і яго праблемамі, думаюць без паспешлівасці і кан'юнктурных меркаванняў, глыбока і па-філасофску, там і нараджаюцца цікавыя творы. Тое ж самае датычыцца тэатральнага калектыву. І тут, як мне думаецца, да месца будзе задаць пытанне, якое доўгі час з'яўляецца тэмай творчых спрэчак. Ці можна ставіць у цэнтры п'есы адмоўнага сучаснага героя, а спектакль зрабіць аб станоўчым у нашым жыцці? Безумоўна, можна. Спектакль «Пад адным небам» пераканальна даводзіць, што спрэчка гэта схаластычная. Справа не ў тым, хто зойме ў творы цэнтральнае месца. Важна, якія вывады зробіць глядач, з якімі думкамі ён пойдзе з тэатра. А прагледзеўшы спектакль «Пад адным небам» у Рускім тэатры імя М. Горкага, можна прыйсці да вываду, што мякішавы — з'ява небяспечная і непрыемная, і ёй не павінна быць месца ў нашым чыстым і прыгожым жыцці.

Дзейсна рыхтуюцца ў Лоеўскім раёне да дэкады самадзейнага мастацтва. У раённым Доме культуры працуюць танцавальны, драматычны, харавы і іншыя гурткі. Развучваюцца новыя песні, рыхтуюцца да пастаноўкі драматычныя творы.

На здымку: актыўныя ўдзельнікі танцавальнага калектыву (злева направа) Праскоўя Даніленка, Зінаіда Цярэшчанка і Марыя Мельнік.

Фота С. ЧЫРЭШКІНА.

НА ХВАЛЯХ ПЕСНІ

Вясна ў прыродзе, вясна на тварах, вясна ў сэрцах... Я адчыняю акно пакоя, у яго ўрываецца сонечная раніца з гулам машын, гукамі радыё. А над горадам плыве песня:

Беларусь — Радзіма,
вольная старонка,
Пра цябе дубровы-славаю
шумяць.
І тваёй вялікай, і тваёй
магутнай,
Багатырскай сіле краю
не відаць...

Не зусім звычайнай была раніца мінулай нядзелі ў горадзе Баранавічы. Вялікія групы святочна апранутых людзей ішлі да маладога парка імя 30-годдзя ВЛКСМ, што раскінуўся ў цэнтры горада, акружаны новымі кварталамі шматпавярховых дамоў. У парку было месца збору ўдзельнікаў гарадскога свята песні і танца.

Людзі рушылі да стадыёна. Гучыць музыка, навокал песні. А вось і святочна ўпрыгожаны стадыён «Лакаматыў».

Узмах рукі галоўнага дырыжора зводнага хору Дз. Вітошкіна, і над стадыёнам, над вуліцамі паплыла мелодыя песні Тулікава «Радзіма, любімая мая!». У паветра ўзнімаецца мноства рознакаляровых шароў. Танцавальны калектыў весела, з задорам выканаў беларускую «Польку».

Зноў выступае хор. Гучаць песні «За мір і свабоду», «Беларусь — Радзіма», «Камсамольская».

Потым прысутныя на стадыёне пачулі, што будзе выканана песня «Аб родным горадзе» самадзейнага кампазітара С. Аліфера на словы работніка Баранавіцкага быткамбіната П. Станкевіча. Тры месяцы назад гарадская газета «Чырвоная звязда» аб'явіла конкурс на лепшую песню. Рэдакцыя атрымала каля 40 тэкстаў песень і больш 10 мелодый. І вось адну з іх выканаў зводны хор на свяце песні. Яе цёпла сустрэлі жыхары Баранавіч.

У заключэнне адбыліся гімнастычныя выступленні школьнікаў. У іх удзельнічала тысяча дзяцей.

У гэты дзень самадзейныя калектывы выступалі ў гарадскіх парках, на адкрытых эстрадах. І ўсюды да самага позняга вечара не сціхалі песні аб міры, аб дружбе, аб шчаслівым жыцці савецкіх людзей.

М. ДАНОВІЧ.

НАШЫ ГОСЦІ

Балгарскі паэт Найдзен Вылчаў

У нас у гасцях — адомы балгарскі паэт і перакладчык Найдзен Вылчаў. Ён прыехаў у нашу рэспубліку ў другі раз, каб прадоўжыць вывучэнне беларускай мовы і літаратуры, гісторыі і культуры Беларусі. Балгарскі госць прывёз радасную навіну: хутка ў Балгарыі выйдзе з друку аднатомнік вершаў і паэм народнага песняра Беларусі Янкі Купалы. Рыхтуюцца да выдання таксама Анталогія беларускай паэзіі, зборнікі А. Куляшова, М. Танка, П. Броўкі і іншых беларускіх паэтаў і пісьменнікаў.

Змяшчаем новыя вершы Найдзена Вылчава.

ЗАПАВЕТ

Сынам маім Уладзіміру і Самуілу

Калі час праб'е,
Сыны,
І з вамі
Развітацца загадае мне, —
Калі прыйдзе смерць,
Як госць нязваны,
І нямольным холадам дыхне,
І зоры белыя спляюць далёка—
Наведама куды,
І сіняй павалокай
Мяне агорне вечар назаўжды, —

Мне спакойна будзе ў ціхім доле,
Калі буду ведаць,
Што нідзе,
Нізашто,
Ні перад кім,
Ніколі
Вы галоў не хіліце ў бядзе,
Што не страшыць крык вас
крумкачыны,
Ні маланак зіхатлівых рой,
І што сонечныя далячыні
Вам відны за мутнаю імглой.

Заклінаю вас:
Не будзьце хілымі!
І пад небам роднай стараны
Толькі перад брацкімі магіламі
На калені падайце, сыны!

СЯМЕЙНАЯ РАНІЦА

Малінавыя губкі сына
У плячо мне дыхаюць цяплом.
Світае,
Дзень паводкай сіняй
Ужо разліўся за акном.
З другога боку гэтак сама
Дыханне роўнае чуваць:
Мой першынец, ён, мабыць,
зараз
Заве мядзведзіка гуляць

І ў сне
Пампушкі-ручаняты
На грудзі бацькавы кладзе.
Салодка спіцца хлапчанятам.
Так пачынаецца мой дзень.

Праз дзверы
З соннага зацішша
Мне ў гэты любы ранні час
Відаць, як чай гатуе ўвішна
Чацвёрты з нас.

На шыбах сонца блісне хутка —
Ужо ўся Віташа ў святле.
І чашкі,
Быццам на пабудку,
Пазвоньваюць на стале.

З балгарскай мовы пераклаў
Ніл ГІЛЕВІЧ.

ЧАЛАВЕК ПЕРАМАГАЕ

А. ВЯРЦІНСКІ

У гэтай аповесці, як у добрай пейзажнай карціне, прысутнічае неба. Тое самае «высокае, справядлівае і добрае неба», якое раптам адкрыў для сябе, лежачы на полі бітвы, талстоўскі герой і перад якім яму здаўся такім маленькім і нікчэмным вялікі палкаводзец з яго інтарэсамі, з яго славалюбствам.

Аповесць В. Быкава «Трэцяя ракета» з таго і пачынаецца, што герой яе глядзіць, лежачы на разасланым шынялі, у сінюю бездань неба і думае аб нечым сваім. Бачыць ён неба і сонечным надвячоркам, калі яно яшчэ зусім сіняе, і ноччу, калі на ім свецяцца зоркі і месяц, і на досвітку, калі яно з кожнай хвілінай святлее, і на ўзыходзе сонца, калі яно аж буяе ад струнких патокаў святла. Не забывае пра неба герой аповесці, ад імя якога вядзецца расказ, нават у час бою. Ён заўважае, што «неба ў дымнай смузе». А потым тое самае чэрвеньскае неба адбіваецца ў нерухомых вачах яго загінуўшых таварышаў. Нарэшце, за пагоркамі сціхае памалу бой, канчаецца цяжкі дзень у жыцці салдата, і ён, знямоглы і спакутаваны, зноў бачыць над галавой светлае, высокае неба, на якім выступілі першыя зоркі.

Так, неба сапраўды прысутнічае ў аповесці В. Быкава, як на жывапісным палатне. Уласна кажучы, чаму толькі ў пейзажным? Ці не лепей прыгадаць карціну, якая па сваім змесце бліжэйшая да аповесці, — «Раніцу на Куліковым полі» Бубнова? Той, хто бачыў яе, ведае, як многа значыць там светлае неба. Без яго палатно не было б тым, чым яно ёсць. Прыкладна такую ж ролю выконвае неба і ў аповесці.

Але звернемся да самой аповесці. Прачытаўшы і потым перачытаўшы яе (перачытваць у дадзеным выпадку, мусіць, абавязкова, бо адразу ў гэтай аповесці ўсяго не «засвоіш»), задаеш сабе пытанне: што ж усё-такі адбылося ў адзін з сонечных летніх дзён вайны, ля невялічкай румынскай вёскі? Аб чым расказаў нам пісьменнік на якіх-небудзь ста з лішнім старонках? Толькі аб самым звычайным эпізодзе вайны, аб тым, як была адбіта чарговая варожая атака і што зрабіў для гэтага адзін артылерыйскі разлік, ці яшчэ аб нечым?

Так, і аб нечым яшчэ. Аб вельмі важным, без чаго не было б гэтай аповесці, як не бывае ніводнага сапраўднага твора, — аб чалавеку. Менавіта аб чалавеку, аб яго лёсе і яго душы, аб тым, як ён павінен выконваць свой абавязак у адносінах да другіх і кім ён павінен быць увогуле.

«У жыцці няма толькі вялікіх ці толькі маленькіх людзей. Так званы «маленькі» чалавек змяшчае ў сабе бездань вялікіх цудоўных якасцей. Я бачу чалавека — вялікага і малога, моцнага і слабага, драматычнага і трагічнага, вясёлага і аптымістычнага. У адным чалавеку, як у самім жыцці. І няхай паэзія наша дыхае чалавечымі пакутамі і радасцямі, болем, пафасам перамогі. Толькі сярод гэтых рыфаў і астравоў, трымаючы ў руках руль свайго карабля, чалавек, быццам Адысей, робіць свой подзвіг». Гэтыя словы належаць Эдуардасу Межалайцісу, аўтару кнігі вершаў «Чалавек».

«Я бачу чалавека...» Гэтыя словы можа з поўным правам сказаць і Васіль Быкаў. Хіба толькі з невялікім удакладненнем: я бачу чалавека на вайне. Але такое ўдакладненне і не абавязкова, бо героі аповесці, асабліва тыя, на чыім баку сімпатыі аўтара, і на вайне застаюцца сапраўднымі людзьмі. Больш таго — на агнявой, у перапынках паміж атакамі ворага, яны яшчэ больш крытычна ставяцца да ўласных недахопаў, яшчэ з большым запалам мараць аб Чалавеку з вялікай літары, аб яго высокім прызначэнні. «Вось! — з горыччу гаворыць гераіня аповесці санінструктар Люся. — Іншы перажывае: медалем не ўзнагародзілі! Іншы імкнецца, як спрытней пахваліцца сілай, пабароць каго ці яшчэ як сябе паказаць... Важна душа ў чалавеку: каб ён быў сумленны, адданы, таварыскі, праўдзівы. Гэта ж найпершае ў чалавеку. Сіла ад прыроды дадзена. Збяцца чалавек можа насуперак сабе, ашукаць каго дзеля карысці сабе — не. Калі ён чысты душой — ніколі не ашукае».

Такім чынам, галоўнае ў чалавека — душа. Гэта значыць, усё тое, што дае яму права называцца чалавекам, што ўзвышае яго над грубай, інстынктыўнай сілай, «ад прыроды дадзенай», над ніцшэанскай «белакурай бестыяй». Ды не ўсе так думаюць, як думае простая савецкая дзяўчына, мабілізаваная на вайну. Люся, як кажа сержант Жаўтых, «на добрай зямлі вырасла. У добры час». Але ёсць яшчэ зямля, на якой «пэўна, адны мухаморы ды порхаўкі розныя растуць. І фашысты яшчэ». «Белакурая бестыя» ва уніформе гітлераўскага салдата дзейнічае, прызнаючы толькі адно права — права сілы. Ідзе вайна, вайна не на жыццё, а на смерць, бо сутыкнуліся не проста два станы, дзве арміі, — сышліся ў смяротным паядынку людзі «добрай» і «дрэннай» зямлі, ваюючь дзве маралі — чалавечая і звярыная.

Не прымаючы пацыфісцкага адмаўлення вайны ўвогуле (адзін з герояў аповесці — сержант Жаўтых гаворыць аб вайне, у якой удзельнічае: «Праўда, тут ужо нічога не скажаш. Тут трэба») і як бы палемізуючы з тымі пісьменнікамі, якія пісалі і пішуць яшчэ «самыя цікавыя кніжкі пра вайну», В. Быкаў ставіць перад сабою задачу паказаць вайну без усялякіх масак і прыкрас і, такім чынам, даўсці да сутнасці, паспрабаваць адказаць на пытанне: што ж гэта ўсё-такі такое — вайна?

З першай часткай гэтай задачы В. Быкаў, на маю думку, спраўляецца паспяхова, я б сказаў: выдатна. Чытаеш аповесць і бачыш, што такое сапраўды алтар вайны, якой цаной дасягалася перамога. І думаеш яшчэ, што не такі ўжо звычайны і малазначны факт — смерць салдата. Тут мала сказаць: «Паведамляем, што ваш сын загінуў, праявіўшы мужнасць і адвагу...» Бо сапраўды, «у адным чалавеку, як у самім жыцці». Кожны радавы Н-скай часці — гэта цэлая аповесць, цэлы свет. У гэты ж свет урываецца дзікі ўраган вайны і ўрэшце знішчае яго зусім, калі чалавечае сэрца перастае біцца.

Трэба сказаць, што тут, у паказе «кухні» вайны, аповесць гучыць з асаблівай сілай, вызначаецца незвычайным маральна-эмацыянальным пафасам. Той, хто чытаў твор, памятае, як памірае стары сержант Жаўтых, які, дарэчы, з'яўляецца ў аповесці выказнікам адвечна народнага погляду на вайну. Падае Жаўтых, падае мужна і ціха, як і належыць паміраць сапраўднаму салдату, так і не паспеўшы адасласць дахаты сваё апошняе пісьмо: «Дарка, я жывы, чаго і табе жадаю. Маркел Іванавіч Жаўтых». «Ну вось, камандзір, засталіся без бацькі і твае дзеці... А ў чацвер камісія...» — няўцямна думаю я (герой аповесці. — **А. В.**) і папраўляю адкінутую ўбок Жаўтыхову руку. Але яна, сагнуўшыся ў локці, зноў памалу разгінаецца, і на запясці, бы нічога ў цэлым свеце не здарылася, паранейшаму рупна цікае трафейны Жаўтыхоў гадзіннічак. Камандзіраў твар, здаецца, ніколькі не змяніўся, можа, толькі больш пасінела парахавое рабацінне на сківіцах, ды неяк натапырылася шчэць. Вочы яго напалову прыплюшчаны, і з-пад павек ледзьве свецяцца нерухомыя бялкі.

— Закрый мала-мала вока, — кажа Папоў. — Навошта глядзі? Хай спіць...

Беражным дотыкам я назаўжды закрываю павекі і, здаецца, не стрымліваюся. Нешта прарываецца ва мне, поўнае злосці, і я дзіка лаюся, так, што аж сам раблюся ненавісным сабе.

— Нічога! Не трэба... — кажа Папоў. — Вайна!

Так, вайна. Няхай яна будзе тройчы, сотні разоў праклята, гэта вайна. Яна кожнага дня вісела над намі ўсе нядоўгія гады нашага жыцця, яна спела, накаплівалася з самай калыскі, якую, прыйшоўшы з папярэдняй вайны, ладзілі нам нашы бацькі. Пад яе чорным крыллем гушкаліся, раслі і вучыліся мы — салдацкія сыны і самі будучыя салдаты. Нашыя маці думалі, што мы — іхнія дзеці, народжаныя імі для ўцехі маладосці і апоры ў старасці, а на справе аказвалася, што не надоўга мы былі ўцехай і рэдка — апорай».

Абвінаваўчым актам супраць вайны, супраць тых, хто ідзе з агнём і мячом на чужую зямлю, гучаць і тыя старонкі аповесці, дзе расказваецца, як трызніць аб мірным жыцці ў мінуты своеасаблівай агоніі вінніцкі пчаляр пехацінец Панасюк («Ой, хлопцы, адваяваўся, так рады!»); як памірае ад ран «слабасільны, тонкі, надламаны палонам» Лук'янаў; як «раптам падае» і падае ўжо назаўсёды Сінявочка-Люся, якая так многа значыць для салдат гарматнага разліку; як трагічна гіне, не вытрымаўшы пякельнага нервовага напружання, ваўкаваты з выгляду, а на самай справе выдатны салдат і таварыш Крывёнак.

Я сказаў: «Абвінаваўчым актам супраць вайны...». Павінен дадаць, што не толькі ў гэтым, не толькі ў адлюстраванні трагічнага боку вайны сэнс адзначаных (можа быць, самых яркіх) старонак аповесці. Яны маюць яшчэ і іншае гучанне, яны — і гераічная кантата, услаўленне духоўнай велічы простага савецкага чалавека, здольнага на любыя ахвяры ў імя перамогі. Толькі ў адной сцэне смерці Крывёнка — і трагізм падзей, і пафас гераізму салдата, і, калі хочаце, вытокі гэтага гераізму, вытокі перамогі.

І тут я лаўлю сябе на слове і пытаю: ці зусім гэта так? Ці не выдаём мы крыху жаданае за сапраўднае, робячы паблажліва скідку на асаблівасці творчай манеры В. Быкава? І, урэшце, ці адказаў усё-такі аўтар аповесці на пытанне, што такое вайна? Так, у пэўным сэнсе адказвае: вайна — зло, вайна — злачынства. Адсюль і антываенны пафас твора.

Род проходит
и род приходит —
род людской
и оружия род.
Неужели
вечен в природе
этот страшный круговорот?

Гэтыя радкі паэта Курэнева В. Быкаў паставіў эпіграфам да асобнага выдання аповесці. І яны, трэба сказаць, добра выказваюць той погляд на вайну, які праводзіцца на старонках «Трэцяй ракеты» і, безумоўна, зразумелы сённяшняму чытачу. Ды і ці можа не ставіцца так пытанне аб вайне ў творы, які датуецца адным з шасцідзесятых гадоў?

Але гэта аб вайне ўвогуле. А як быць з той вайной, якая ўяўляе сабой канкрэтную гістарычную падзею і дзень перамогі ў якой мы адзначаем 9-га мая? Ці можна скласці паводле аповесці правільнае ўяўленне, што гэта была за вайна? У асноўным — можна. Як ужо адзначалася, аўтар паказвае вайну праўдзіва і ярка. Аднак, разам з тым, мы адчуваем, што нейкага штрыха, нейкага важнага мазка на палатне не хапае. І, напэўна, менавіта таго, які праліў бы святло і на другі, вельмі істотны, бок вайны, паказаў бы і другі, вонкавы бок медаля.

Кажуць, што Хэмінгуэй вучыўся пісаць аб вайне ў Л. Талстога. Магчыма, і сапраўды так. Факт той, што «Севастопальскія апавяданні» зрабілі на яго вялікае ўражанне і дераканалі яго ў тым, што вайна «гэта адна з самых важных тэм, прытым такая, аб якой цяжэй за ўсё пісаць праўдзіва». «Севастопальскія апавяданні» сапраўды з'яўляюцца ўзорам рэалістычнага паказу вайны, паказу чалавека на вайне. Але Талстой бачыць на вайне і тое, што «ўзвышае дух», бачыць у вачах, размовах і паводзінах абаронцаў Севастопаля пачуццё, якое прымушае салдат прымаць вайну, зрабіла з іх «людзей, што так жа спакойна жывуць пад ядрамі, пры ста выпадковасцях смерці, замест адной, якая наканавана ўсім людзям». Пачуццё гэтае — любоў да радзімы.

Герої В. Быкава таксама — патрыёты. Да таго ж яны патрыёты савецкай зямлі, яны прадстаўляюць на вайне самую перадавую, самую гуманную мараль. Тым не менш, пісьменнік канцэнтруе іншы раз увагу не столькі на тым, як людзі разумеюць і прымаюць вайну, а на тым, як яны не прымаюць яе. Тут, відаць, зрабіў уплыў той ракурс, які выбраў В. Быкаў для паказу чалавека на вайне.

І апошняя думка, апошняе ўражанне, якое выклікае гэта на дзіва ёмістая і цікавая, хоць, як бачым, і не пазбаўленая пэўных недахопаў кніга. Справа ў тым, што змест аповесці не вычэрпваецца паказам вайны ў прамым сэнсе гэтага слова. Твор называецца — «Трэцяя ракета» (дарэчы, на маю думку, загаловак кнігі няўдалы: па-першае, ён занадта ўжо прэтэнцыёзны; па-другое, слова — **ракета** для сучаснага чытача асацыіруецца з зусім іншымі ракетамі). А трэцюю ракету герой аповесці пасылае, замест кулі, у твар свайго аднапалчанына — Задарожнага. Такім чынам, героям аповесці даводзіцца змагацца не толькі з тымі, хто па той бок перадавой, а весці яшчэ і «бітву ў дарозе». І Васіль Быкаў памайстэрску справіўся і з гэтай, не менш важнай і складанай задачай — з пастаноўкай і вырашэннем маральна-этычнай праблемы. Прычым паказаў сябе тут як майстар смелага мастацкага завастрэння і абагульнення.

Аб гэтым сведчаць і вобраз Задарожнага, які, на маю думку, выпісаны вельмі выразна і з'яўляецца адным з лепшых, так званых адмоўных вобразаў В. Быкава, і асабліва вобраз Люсі. Вобраз Люсі патрэбен пісьменніку не для таго, каб прыправіць твор любоўнай інтрыжкай, даць магчымасць пасмакаваць чытачу лішні раз даволі банальны раман франтавіка з медсястрой. Не, быкаўская Люся — гэта нешта зусім іншае. Недарэмна яна так многа значыць у цяжкі дзень вайны для герояў аповесці. Недарэмна яны не любяць (любяць па-сапраўднаму, не так, як Задарожны) як жанчыну, другія — як чалавека.

Недарэмна адзін герой аповесці гаворыць аб неабходнасці паважаць жанчыну і называе яе «антаганістам злачынства».

Вобраз Люсі нясе вялікую ідэйна-эмацыянальную нагрузку. В. Быкаў стварае яго для таго, каб паўней паказаць маральнае аблічча, духоўны змест сваіх герояў, выпрабаваць іх не толькі ў абставінах выканання імі салдацкага абавязку, але і праз адносіны да жанчыны. І гэта зразумела, бо па словах Маркса, узаемаадносіны мужчыны і жанчыны з'яўляюцца паказчыкам таго, наколькі прырода ўжо «ачалавечана» ў чалавеку і наколькі ён застаецца яшчэ пад уладай прыроды. І тут зноў прыгадваюцца словы гераіні аповесці: «Важна душа ў чалавеку... Сіла ад прыроды дадзена».

... «Што б са мной не сталася яшчэ — горш і страшней, чым сёння, мне ўжо ніколі не будзе». Гэтымі словамі заканчваецца аповесць. Чалавек бывае і шчаслівым. У яго жыцці нямала дзён, калі яму лёгка і радасна. Чалавек бывае творцам і сейбітам, каханым і бацькам. Але даводзіцца яму яшчэ быць і салдатам. І тады яму бывае цяжка. В. Быкаў выбраў самы цяжкі дзень у жыцці чалавека. Такі дзень, калі чалавек змагаецца. Змагаецца не толькі з тым, хто замахваецца на яго святое права жыць і быць гаспадаром свайго лёсу, але яшчэ і з тым, хто жыве побач і ў той жа час не прызнае сапраўды чалавечай маралі. І чалавек перамагае. Ды інакш і не можа быць, бо яго бой «святы і правы», бо светлыя і шырокія гарызонты яго ідэалаў.

Гарызонт жа заўсёды змыкаецца з небам — тым добрым, справядлівым, высокім небам, што «ўбачыў і зразумеў», як і талстоўскі персанаж, герой аповесці, і якое сімвалізуе ў ёй вялікую чалавечую праўду, дзеля якой варта пастаяць у бай да канца.

Выйшлі з друку

У Дзяржаўным выдавецтве БССР выйшлі з друку і паступілі ў продаж наступныя кнігі мастацкай і музычнай літаратуры:

Дзмітрый Уксусаў. Я — твой сябра. Аповесць. На рускай мове. Мастак Ю. Пучынскі. Тыраж 20 тыс. экз., стар. 252. Цана 35 кап.

Міхась Стральцоў. Блакітны вецер. Апавяданні. Мастак Б. Забораў. Тыраж 4 тыс. экз., стар. 136. Цана 11 кап.

Пятро Рунец. Вясёлыя здарэнні. Апавяданні. Для дашкольнага і малодшага ўзросту. Малюнкі І. Нікрасава. Тыраж 35 тыс. экз., стар. 16. Цана 6 кап.

Ус. Раждзественскі і М. Вярзілін. Сцяжынка ў лес. Для малодшага ўзросту. Пераклад з рускай мовы М. Калачынскага. Малюнкі Ю. Смольнікава. Вокладка і тытул А. Кашкурэвіча. Тыраж 7 тыс. экз., стар. 46. Цана 40 кап.

Леў Касіль. Пра жыццё зусім добрае. Для сярэдняга ўзросту. Пераклад з рускай мовы Я. Васілёнка. Афармленне Е. Ванюкова і А. Іткіна. Вокладка Я. Тараса. Тыраж 6 600 экз., стар. 164. Цана 28 кап.

Польскія народныя песні. Выбранае. Запіс Г. Цітовіча. Мастак В. Харэўскі. На польскай і беларускай мовах. Тыраж 1 тыс. экз., стар. 132. Цана 36 кап.

Сцэна з тэлеспектакля «Далёкая песня». У ролі Аніды — Р. Гладунко, у ролі Алонзы — Р. Янкоўскі.

АДРАСАВАНА ДА СЭРЦА ГЛЕДАЧА

П'ЕСА «ДАЛЁКАЯ ПЕСНЯ» К. ГУБАРЭВІЧА НА ЭКРАНЕ ТЭЛЕВІЗАРА

Звіняць знаёмыя, родныя галасы цымбал. Гойдаюцца на ветры бярозы, сосны. Беларусь, Белавежская пушча... Радзіма... Няма ў чалавека пачуцця, мацнейшага за любоў да радзімы, за тугу па родным краі. «Гэта ж толькі адным духам яе падыхаць — нічога больш не трэба на свеце!» — гаворыць адзін з герояў новай п'есы К. Губарэвіча «Далёкая песня». Гэтай змястоўнай фразай вызначаецца галоўная ідэя п'есы і спектакля Мінскай студыі тэлебачання.

...Вінцэсь Крыўчэня прыехаў у Аргенціну, пакінуўшы сваю няласкавую айчыну, якая знаходзілася пад прыгнётам польскіх паноў. Доўгія гады ён бадзяўся па чужой краіне ў пошуках працы, у пошуках шчасця. Пастарэў Вінцэсь, сцівеў, пастарэла і сівой стала яго Куліна. Выраслі ў іх дзеці — прыгажуня і пявуння Аніда, шчыры мужны Антоніо. Аніда і Антоніо — зусім аргенцінцы, ніхто іх і не адрозніць ад грамадзян гэтай краіны. Толькі дома, для бацькі з маці, для сяброў-суайчыннікаў яны — Ганна і Антось. І хоць нарадзіліся дзеці пад чужым небам, сэрцы іх жыва адгукаюцца на словы маці: «Тут не свой кут. Трыццаць гадоў жыву ў вашай Аргенціне, а душа ні да чаго не прыстае. І людзі, быццам, як людзі, не хачу ганіць, а ўсё ж не сваё. Ніяк не прывыкну. Ніяк не прывыкну...» Ды і ці можа прывыкнуць, ці можа забыць сваю радзіму, калі ў ёй — і ў Вінцэся, і ў Куліны, і ў Ганны, і ў Антося — жыве, не можа не жыць, не можа не ўзрастаць, не можа не ўсвядамляцца, не можа не ўзмацняцца, не можа не ўзнімацца

МАСТАК-ГУМАНІСТ

Да стагоддзя з дня нараджэння М. НЕСЦЕРАВА

Імя выдатнага рускага жывапісца, заслужанага дзеяча мастацтваў РСФСР Міхаіла Васільевіча Несцерава было шырока вядома яшчэ да Кастрычніцкай рэвалюцыі. Вучачыся ў майстэрнях вядомых мастакоў В. Пярова і І. Прянішнікава, Несцераў у свой час многаму навучыўся на іх творчасці, пераняў іх манеру пісьма і працы. Свой творчы шлях ён пачынаў са стварэння жанрава-бытавых рэалістычных карцін у духу перадвіжнікаў («Дамашні арыш», «Знаўца»).

Быў некаторы перыяд у жыцці маладога мастака, калі ён перажываў глыбокі творчы крызіс і пісаў на гістарычна-рэлігійныя тэмы. Але ён хутка перамагае гэты крызіс і зноў вяртаецца на шлях рэалістычнага мастацтва.

Несцераў — мастак-лірык, які з трапяткім хваляваннем, з лірычным настроем адлюстроўваў у карцінах жывую рускую прыроду. Кучаравыя бярозкі, цихія вечары, сонныя яліны, высокі бераг Волгі — усё гэта глыбока кранала вялікае сэрца мастака-гуманіста. Ён бачыў, адчуваў і з высокім майстэрствам, з мудрай народнай філасофіяй умеў перадаваць у сваіх палотнах вечную прыгажосць рускага пейзажу.

Ва ўсіх творах М. Несцерава выразна адчуваецца сваё непаўторнае ўспрыняцце рэчаіснасці. Неацэнны ўклад унёс ён у развіццё партрэтнага жанра. М. В. Несцераў з'яўляецца адным з заснавальнікаў савецкага класічнага партрэта. Ён піша цэлую серыю мастацкіх партрэтаў дзеячоў культуры нашай краіны. Усе яны прасякнуты вялікай унутранай псіхалагічнасцю і індывідуальна выразнай характарыстыкай. Гэтыя творы — сапраўдныя шэдэўры савецкага партрэтнага жывапісу, у якім Несцераў паказаў сябе як мастак-віртуоз, бліскучы майстра малюнка, кампазіцыі, эскіза, як знаўца душэўнага багацця і прыгажосці савецкага чалавека. Доказам гэтага можа быць неўміручая галерэя яго славутых «Аўтапартрэтаў», сінтэтызаваны партрэт-карціна скульптара І. Шадра.

З высокім майстэрствам выкананы М. Несцеравым партрэты-карціны савецкага скульптара В. Мухінай, вучонага А. Северцава, доктара-хірурга С. Юдзіна, мастака Я. Круглікавай. Партрэт-карціна вучонага акадэміка І. П. Паўлава быў адзначаны Дзяржаўнай прэміяй і дыпломам.

М. В. НЕСЦЕРАЎ. Партрэт В. І. Мухінай.

М. Несцераў пражыў вялікае, змястоўнае жыццё. Наша партыя і народ высока ацанілі яго самаадданую працу. Ён быў узнагароджаны многімі дыпломамі, ордэнамі, прэміямі.

Мастак пакінуў багатую творчую спадчыну, якая беражліва захоўваецца ў Трацяцкоўскай галерэі, у Ленінградскім рускім і ў многіх іншых рэспубліканскіх мастацкіх музеях, у тым ліку і ў Мастацкім музеі БССР. У нашай экспазіцыі ёсць карціны «За Волгай», «Вандроўнікі», «Айцец Сергій», «Сяброўкі» (у двух варыянтах), «Ля манастырскай сцяны», «Зара вячэрняя», «Гасіры» і інш.

Нельга не адзначыць літаратурнай дзейнасці М. Несцерава. Яго пяру належыць кніга «Даўнія дні. Сустрэчы і ўспаміны».

Адзначаючы стагоддзе з дня нараджэння М. Несцерава, наш народ ушаноўвае памяць вялікага мастака-жывапісца. На яго рэалістычных творах многія савецкія мастакі вучацца пазнаваць прыгожае, ідэйна-гуманнае мастацтва карціны, партрэта, пейзажа, што адлюстроўваюць неўміручыя гераічныя вобразы нашых выдатных сучаснікаў, будаўнікоў светлай будучыні.

М. ТАРАСІКАЎ,
мастак.

ПАЛІМЕРЫ ПРЫХОДЗЯЦЬ НА СЦЭНУ

Цудоўныя ўласцівасці новых сінтэтычных матэрыялаў даюць магчымасць шырока скарыстоўваць іх у розных галінах народнай гаспадаркі, у тым ліку ў тэатры і кінематаграфіі.

Палімеры паспяхова пракладваюць сабе шлях на сцэну. Яшчэ зусім нядаўна дэкарацыйнае лісце рабілі з марлі, бавоўнянай тканіны, аксаміту. Яно хутка камячылася, змяняла колер і не было падобна на сапраўднае. У эксперыментальных майстэрнях МХАТ'а распрацаваны рэцэпт і вырабляецца бутафорскае лісце з новага віду негаручага палівінілхларыднага пластыку. Такое лісце не камечыцца, не траціць ні колеру, ні бляску і прапускае святло пражэктараў, як сапраўднае лісце — сонечныя прамені.

У Тэатры імя Станіслаўскага і Немяровіча-Данчанкі ў спектаклі «Жанна д'Арк» паспяхова скарыстоўваюцца металічныя воінскія даспехі з найлягчэйшай палівінілхларыднай плёнкі.

У студыі «Масфільм» з вінапласту вырабляюцца бутафорыя і дэталі дэкарацый. З яго значна хутчэй рабіць, чым з пап'е-машэ, якое скарыстоўвалася раней.

У нядаўна выпушчаным кінафільме «Чалавек-амфібія», знятым кінастудыяй «Ленфільм», усе дэкарацыі марскога дна былі зроблены з пластмасы. Яны паспяхова вытрымалі ўздзеянне марской вады і не страцілі сваю афарбоўку.

У Вялікім тэатры Саюза ССР фарбы для дэкарацый разводзяць латэксам — спецыяльным хімікатам. Гэта робіць фарбу больш стойкаю, да таго ж яна не зляпае з дэкарацый у выглядзе дробнага пылу, які вельмі шкодна ўплывае на галасавыя звязкі і дыханне артыстаў. Дэкарацыі, пакрытыя такімі фарбамі, доўгі час застаюцца яркія, свежыя, не патрабуюць абнаўлення, рэстаўрацыі і не баяцца вады.

Шырока ўжываюцца пластмасы і ў тэхнічнай тэхніцы. Асабліва для так званага пластычнага грыму — лацэксы некаторых сінтэтычных каўчукаў і іншых сінтэтычных палімераў.

Вялікае значэнне набываюць пластмасы і ў справе ўдасканалення кінематаграфіі, узнікненне якой у значнай ступені абавязана выкарыстанню палімераў. У арсенале тэхнічных сродкаў кінематаграфіі палімерныя матэрыялы таксама займаюць значнае месца. З гэтых матэрыялаў вырабляецца кінаплёнка, кінаэкраны, кінадэкарацыі і бутафорская тэхніка на кінастудыях.

Вялікае значэнне набываюць сінтэтычныя матэрыялы ў дэкарацыйна-бутафорскай тэхніцы. Як вядома, да апошняга часу ў кінадэкарацыйнай тэхніцы асноўным матэрыялам з'яўлялася дрэва, а ў бутафорыі — гіпс і пап'е-машэ. Замена гэтых матэрыялаў палімерамі рэзка павысіла прадукцыйнасць працы, скараціла тэрмін вырабу дэкарацый і бутафорыі і, што самае галоўнае, значна палепшыла іх якасць.

Сур'ёзныя поспехі дасягнуты ва ўжыванні пластмас на кінастудыі «Масфільм» і іншых кінастудыях краіны. Так, напрыклад, на кінастудыі «Масфільм» распрацаваны і скарыстоўваецца метад вырабу бутафорыі і рэквізіту з пластычных мас шляхам вакуумнага ліцця. Дзякуючы гэтаму рэзка скараціліся тэрміны выканання работ і значна палепшылася якасць вырабаў. Дастаткова сказаць, што пры гэтым прадукцыйнасць працы рабочых узрасла прыкладна ў 8—10 разоў, вытворчы цыкл скараціўся ў 60—70 разоў, а сабекошт знізіўся амаль у 12 разоў.

Палатно, жывёльныя клеі, дрэва, метал, цвікі саступаюць дарогу пластмасам, сінтэтычным клеям і смолам.

Цікава адзначыць, што ў сярэдзіне мінулага стагоддзя ў газетных паведамленнях, прысвечаных выступленням у Пецярбургу ў балеце «Дачыны Дуная» славутай танцаўшчыцы Тальёні, гаварылася, што гледачы былі прыемна здзіўлены зробленай пецярбургскім заводам шкляным калонай, якая адыгрывала істотную ролю ў дэкарацыях гэтага балета.

Мінула сто год, і шкло, ужо ў новай якасці, зноў з'яўляецца на сцэне тэатраў і кіно. Сёння з найтанчэйшых шкляных нітак вырабляюцца тэатральныя заслоны, шторы і іншыя дэкаратыўныя тканіны.

Шклотканіны знайшлі шырокае прымяненне і на кінастудыях. Патроху пранікаюць палімеры і ў беларускі тэатр. Так, напрыклад, у Тэатры оперы і балета з палімераў зрабілі бутафорскія кветкі. На жаль, гэта адзінкавы выпадак. Будзем спадзявацца, што неўзабаве пластмасы ў тэатрах і кінастудыях рэспублікі будуць прымяняцца шырока.

А. ТАФ.

НА МІНСКІМ ВОЗЕРЫ.
Фота Ул. КРУКА.

СПЕКТАКЛІ НАРОДНЫХ ТЭАТРАЎ

За апошні час на сцэне Дуброўенскага раённага Дома культуры паказалі свае лепшыя спектаклі народныя тэатры клуба чыгуначнікаў станцыі Орша і Багушэўск.

Аршанцы пазнаёмілі суседзяў з «Іркуцкай гісторыяй» А. Арбузава, багушэўцы — з камедыяй «Лявоніха на арбіце» А. Макаёнка.

КУРСЫ АМАТАРАЎ КНІГІ

Такія курсы з незвычайнай назвай існуюць пры Лепельскай раённай бібліятэцы. У іх займаецца 15 дзяўчат, якія пажадалі вывучаць бібліятэчную справу. Сярод іх — майстар камбіната бытавога абслугоўвання Т. Карманава, повар Г. Арцыменак, медработнік Т. Міроненка, рабочая Е. Шыдлоўская і іншыя. На працягу шасці месяцаў дзяўчаты вывучалі тэхніку апрацоўкі кнігі, формы і метады прапаганды літаратуры, методыку арганізацыі літаратурных вечароў. Пасля заканчэння курсаў слухачы здолеюць працаваць у сельскіх бібліятэках раёна.

Зкінакамерай па рэспубліцы

Мінская студыя навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў выпусціла на экраны гарадскіх кінатэатраў і сельскіх клубаў чарговы, чатырнаццаты нумар кінахасопіса «Савецкая Беларусь». Першыя кадры кінахасопіса расказваюць аб святкаванні працоўнымі нашай рэспублікі 50-годдзя з дня выхаду ў свет газеты «Правда».

Гнеў народаў ўсяго свету выклікалі злачынныя дзеянні імперыялістаў ЗША, на загаду іх пачаліся новыя тэрмандзерныя выпрабаванні. Спыніць крывавую руку атамных вар'ятаў, спыніць выпрабаванні тэрмандзернай зброі! — патрабуюць працоўныя Савецкай Беларусі. Аб гэтым расказвае другі сюжэт кінахасопіса — «Гнеўны пратэст».

Вялікую цікавасць выклікаюць у гледачоў кінакадры аб сельскіх механізатарах-вынаходніках Доўскай вопытна-паказальнай станцыі.

Аб тым, як віцябляне навучыліся скарыстоўваць адыходы драўніны і вырабляць з яе мэблю, гледачы даведаюцца, прагледзеўшы кінарэпартаж з новага цэха Віцебскага домабудаўнічага камбіната.

У кінахасопісе расказваецца аб слаўных справах беларускіх піянераў, аб самаадданай працы нейрахірурга Ніны Якаўлеўны Красільнікавай.

Гледачы праслухаюць асобныя фрагменты з канцэрта японскай скрыпачкі лаўрэата Другога Міжнароднага конкурсу імя Чайкоўскага Йоко Куба.

Навіны Навіны

□ У Гомелі закончыў гастролі Смаленскі драматычны тэатр. На змену смаленскім артыстам прыехаў Валынскі абласны ўкраінскі музычна-драматычны тэатр імя Т. Шаўчэнкі. Артысты братняй Украіны пакажуць гамяльчанам спектаклі «Сэрца паэта» па п'есе львоўскага драматурга Н. Леўчанкі, «Над блакітным Дунаем» І. Рачады, «Беражы сваё шчасце» З. Калеснікавай, «Ключы да шчасця» А. Карнієнкі, «Маруся Багуслаўка» М. Старыцкага і іншыя пастаноўкі.

□ Днямі ў нашу сталіцу па запрашэнню Мінскай студыі тэлебачання прыехаў Дзяржаўны тэатр юнага гледача Латвійскай ССР імя Ленінскага камсамола.

Артысты братняй рэспублікі паказалі мінчанам два спектаклі — «Былыя хлопчыкі» И. Івантэр і «Дах для Матуфля» французскага драматурга Іва Жанінка.

□ Брыгада артыстаў эстрады Львоўскай абласной філармоніі прыехала на гастролі ў Гродзенскую і Брэсцкую вобласць. Першыя канцэрты адбыліся ў Баранавіцкім і Лідскім раёнах.

□ Спектаклем па п'есе І. Даарэцнага «Вялікае хваляванне» пачаў свае гастролі ў Магілёве Брэсцкі абласны драматычны тэатр імя Ленінскага камсамола Беларусі.

Адначасова тэатр будзе выязджаць са спектаклямі ў горад Бабруйск.

НА ЛЯСНЫХ СЦЕЖКАХ

Чалавек і прырода

Адам Сцяпанавіч крочыць не спяшаючыся. Абход вялікі — паўтысячы гектараў лесу. За дзень натомішся. Раз-пораз ён пазірае на каржакаватыя камлі ёлак з сівымі імшыстымі барадамі. Лес спявае сваю адвечную песню. Нешта таямнічае чуецца ў ёй. Можа, у гэтых густых шатах застыла іншая песня — недапетая заслонаўцамі, ці захавалася водгулле глухіх выбухаў?

Ляснік выйшаў на прасеку. Над галавой тонкімі пералівамі звіняць мухалоўкі і чыжы, дзесьці пастуквае дзяцел. Пахне свежым лясным настоем. Раптам з духмяным водарам кветак і траў пачаў змешвацца гаркаваты пах дыму. Узнікла трывожная думка — «Ці не пажар?»

Адам Сцяпанавіч пабег туды, адкуль вецер прыносіў дым. Займала дыханне, ручаямі сцякаў салёны пот. Вось і пералесак. Гарэла сухая трава. Вогненныя языкі паўзлі да густога ельніку. Ляснік скінуў кіцель і пачаў збіваць ім полымя. У адных месцах яно тухла, у другіх успыхвала яшчэ ярчэй, быццам у яго падлівалі мазут. Абпёк рукі, абгарэлі вейкі і бровы, пачало дыміцца адзенне. Злева затрашчаў ельнік. Адам кінуў кіцель і пабег з сякерай у ельнік. Узмах, другі, трэці... Ёлкі адна за адной падалі. Наткнуўшыся на перашкоду, полымя паступова пачало адступаць. Адам зноў схапіў кіцель і зноў пачаў раз'юшана збіваць полымя. Яшчэ некалькі ўзмахаў, і агонь знік, але чалавека пакінулі сілы.

Апрытомнеў Адам ад нечага халоднага. Расплюшчыў вочы — перад ім стаяў сын Сцяпан.

— Тушы... Я не магу ўжо.

— Агонь патух, тата. Дай абмыю твар...

— Лепш напіцца падай. Халаднейшай толькі...

Адам прагна піў з сынавай шапкі ваду.

— Нягоднікі! — злосна праказаў ён. — Каб даведаўся хто — у суд бы яго.

...Сонца кацілася на захад. Яго праменні золатам адлівалі на медных ствалах сосноў. Макаўкі мудранкі, чашачкі падхвойніку і званочкі ландыша цягнуліся ўгару, з сумам праводзячы чырвоны шар. У нізіне плыў сівы туман, густа ахутваючы папараць.

Бацька з сынам крочаць дамоў. Ідуць моўчкі. Першым парушыў маўчанне бацька:

— Чуў я аб справах у тваім абходзе. Парубшчыкаў завёў.

І зноў праз хвіліну:

— Не ў бацьку ты ўдаўся: не любіш лесу. Шкада! А я без яго жыць не магу.

На ростаньках дарог разышліся. Сцяпан падаўся ў Юрцава, Адам павярнуў у Стаўбуны. Адчувалася стома. Ногі як паўсвету схадзілі, і рукам перапала на пажары. На сэрца лёг нейкі асаблівы і дяжкі смутак. Калі два гады назад сын падаўся ў леснікі, бацька, здавалася, памаладзеў на добры дзесятак год. Але Сцяпан стаў падводзіць. Пайшлі чуткі, што ён заглядвае ў пляшку, дае волю парубшчыкам. Праўда, раней сяды-тады Адам Сцяпанавіч наведваўся ў сынаў абход. Знайшоў нават свежы пень. Але сын сцвярджаў, што не бачыў нічога і сам хваляваўся не менш за бацьку. Паверыў. А цяпер папаўзлі брыдкія чуткі. «Трэба абавязкова пабываць у сёмым...» — вырашыў Адам.

Да поўдня Адам Сцяпанавіч паспеў пабываць на дзялянках маладога лесу. Параіў сёе-тое рабочым, што вялі праполку, сам заняўся санітарным упарадкаваннем участка: высякаў сушняк, зносіў у лаўжы ламачча. Работы ў лесе хапае. Намахаўшыся сякерай, прысеў на пень.

У лесе ціха. Толькі зрэдку па вершалінах дрэў прабягае ветрык ды недзе рыпіць ясень. Але раптам ветрык узмацнеў, парывіста загаманіў у вершалінах асін і бяроз. І скрозь гэты шум пачуўся далёкі глухі стогн: недзе ўпала дрэва. Тарасевіч стаў уважліва прыслухоўвацца. Вецер крыху суняўся, ляснік выразна пачуў, як зноў шаснула дрэва. «У сёмым абходзе...», — здагадаўся ён.

Не зважаючы на стому, Адам Сцяпанавіч таропка пайшоў на гук. Ён прабіраўся праз зарасніклі дробнага хвойніку, пабег у тым напрамку, адкуль даносіліся глухія гукі сякеры. Маладыя ёлачкі білі лесніка калючымі лапкамі, блыталася пад нагамі трава. Толькі тонкія дрэвы, нібы ведаючы, у чым справа, расступаліся, даючы дарогу. Займала дыханне. Раз-пораз Тарасевіч спыняўся, каб перавесці дух, і тады чуў, як гулка стукала сэрца. «Толькі б не спазніцца», — думаў ён.

Іх было трое. Трэці... сын Сцяпан. На свежым пні стаялі дзве бутэлькі, ляжала луста хлеба і скрыль сала. Добра захмялелыя, усе трое голасна размаўлялі. Адам Сцяпанавіч паявіўся перад імі нечакана. Яго хударлявы твар з вастраватым носам быў суровы і злосны. Двое адразу разгубіліся. А Сцяпан устаў і нявесела пажартаваў:

— Позна, бацька... Ні грама не засталося... Трошкі б паспяшаўся.

— Дзякуй, сынку. Я, здаецца, своечасова трапіў...

Адам Сцяпанавіч цяжка ўздыхнуў:

— Давай акт афармляць.

Парубшчыкі насцярожыліся.

— Не тваё ж, Адам, — сказаў старэйшы, — лесу ніколі ўсяго не высячаш.

— Такія караеды, як вы, усё папсавалі б, дай ім толькі волю, — не сказаў, а крыкнуў ляснік.

І зноў сыну:

— Акт складай!

— Няёмка неяк, — адказаў сын.

Старэйшы з парубшчыкаў пачаў больш лагодна і ліслива:

— Ці варта сварыцца за нейкія тры дрэвы? Ды ўсё, браток, будзе шыта-крыта... Ламачча прыбярэм, спалім, пні таксама знішчым.

— Я — камуніст, ты гэта чуеш? Разумееш? — не стрымаў душэўнага гневу стары ляснік.

У канцылярыі Аршанскага лясніцтва здзівіліся. Бацька просіць, каб сына зволілі з работы, нават не просіць, а патрабуе:

— Нельга трымаць яго лесніком.

Ляснічы Канстанцін Рыгоравіч Нордзін уважліва паглядзеў на Адама Сцяпанавіча. Большую палову жыцця аддаў стары ахове «зялёнага сябра». У зімовую завіруху, у навальніцы і лёўні ён заўсёды на абходзе. Расказваюць, што аднойчы аглушыла яго пад дрэвам маланкай. Ляснік абхапіў рукамі камель і ляжаў, пакуль не апрытомнеў. Многа чаго было ў яго жыцці. Ляснічы ўспомніў і пра узнагароду — Ганаровай граматай Міністэрства лясной гаспадаркі БССР і нагрудным значкам «Выдатнік аховы лесу» ўзнагародзілі Адама Сцяпанавіча. Штогод ён атрымлівае прэміі, яго ставяць у прыклад іншым. Непрымірымы, прынцыповы стары.

— Зволім, — адказаў ляснічы. — Але мо ты памыляешся, гэта ж усё-такі твой сын?

— Не, — уздыхнуў ляснік, — спадзяваўся, думаў гаспадаром лесу будзе, аж не...

Праз тыдзень бацька і сын зноў размінуліся на ростаньках дарог. Сын ішоў з абходу апошні раз. Яго ўчастак прыняў новы гаспадар.

— Не крыўдуй, Сцяпан, — уздыхнуў Адам Сцяпанавіч. — Нельга табе лесніком заставацца.

Стары памаўчаў і дадаў:

— І ў чарку радзей заглядвай. Яна наогул... Чуеш, сынку, — не прывядзе да дабра.

Сцяпан пачырванеў:

— Бывай, тата.

— Добрай дарогі, — кінуў бацька.

Наляцеў свежы вецер і пачаў тузаць за плечы кучаравыя бярозкі. Па небу на перагонкі плылі шарыя, як аўчынкі, хмаркі. Пырснулі першыя кропкі дажджу.

Адам Сцяпанавіч пастаяў ля маладых дубкоў. Цягнуцца да сонца дрэўцы. Задумаўся, не адводзячы ад іх вачэй. Раптам яго твар пасвятлеў.

— Міхась, — паклікаў ён рабочага, які палоў дзялянку.

— Што?

— Паглядзіш, якія асілкі вырастуць...

А. МАРКАЎ,
М. ВОРАНАЎ.

Аршанскі раён.

Кіно за рубяжом

ПОЛЬШЧА

«Імперыя маўчання» — так называецца новы публіцыстычны фільм рэжысёра Талэвуша Яворскага, што выйшаў на экраны. Змест фільма — 80 дзён гераічнага ўрада незалежнага Конга на чале з прэм'ерам Лумумбам. У фільме даюцца праўдзівыя, маляўнічыя нарысы пра Лумумбу, яго саратнікаў і пра барацьбу свабодалюбівых кангалезцаў супраць прыгнёту міжнароднага каланіялізму.

ГДР

Аўтар фільма «Пяць патронных гільз», які дэманстраваўся ў Савецкім Саюзе, рэжысёр Франк Бейер ставіць фільм па сваім сцэнарыі «У воўчай пашчы». Гэта экранізацыя аднайменнага рамана Бруно Апіца (ёсць рускі пераклад), прысвечанага ахвярам фашысцкіх лагераў смерці. Натурныя здымкі будуць праводзіцца ў Бухенвальдзе.

ЧЭХАСЛАВАКІЯ

Поўнаметражны мастацкі фільм аб папулярнай народнай чэшскай пісьменніцы Бажэне Нямцовай (наш глядач знаёмы з фільмам «Дзікая Бара» па яе апавяданню), стагоддзе з дня смерці якой спаўняецца сёлета, ставіць рэжысёр Атакар Ваўра па сцэнарыі Францішка Паўлічэка.

ЗША

Прадзюсер Э. Ландау вырашыў перанесці на экран поўны збор п'ес вялікага амерыканскага драматурга Юджына О' Нейля. Гэтую своеасаблівую энцыклапедыю творчасці пісьменніка Ландау намерен ажыццявіць на працягу трох год.

ІТАЛІЯ

Дваццацігадовы італьянскі студэнт Бернарда Барталучы здымае ў адным з бяднейшых прыгарадаў Рыма фільм пад назвай «Смерць» па сцэнарыі П'ера Паола Пазаліні. Гэта гісторыя расследавання паліцыяй злачынства ў квартале, дзе жывуць самыя абяздоленыя людзі — люмпенпралетарыі, бадзягі, жабракі, дзе пануе злачынны свет. Як і ў папярэднім фільме Пазаліні «Жабрак», усе галоўныя ролі выконваюцца самімі жыхарамі трушчоб.

Пентагон: — Не турбуйцеся, гаспадар, ён у мяне на адкорме!..

Мал. Ул. БАРАНОЎСКАГА.

ДУХОЎНАЯ КАЛАНІЗАЦЫЯ

З ЧАСОПІСА «ДЭМАКРАТЫЧНАЯ РЭСПУБЛІКА В'ЕТНАМ»

□ □

У 1950 годзе вайна Супраціўлення в'етнамскага народа ўвайшла ў рашаючую стадыю. Амерыканцы адкрыта памагалі французскім каланізатарам працягваць захопніцкую вайну ў Індакітаі і паступова выцяснялі іх з мэтай акупацыі ўсёй Індакітайскай тэрыторыі.

Амерыканцы стараліся паступова захапіць у свае рукі ваенныя і палітычныя справы. Адначасова ў Індакітай прыязджалі шматлікія амерыканскія культурныя місіі, пасланыя Вашынгтонам, ці Нью-Йоркам, ці нават ААН для распрацоўкі плана пранікнення амерыканскай культуры ў Індакітай. Амерыканцы заахвочвалі захаванне і развіццё культурных арганізацый, патрэбных для іх дзейнасці, і ў той жа час стваралі новыя для ажыццяўлення сваіх карыслівых задум. Так, побач з «Таварыствам індакітайскага кавучання», арганізаваным французамі, амерыканцы заснавалі «Ротары клуб», «Азія Фаундэйшн», «Азія калча Асашыейшн» і «В'етнамезе Амерыкэн Асашыейшн». Пасля стварэння такіх арганізацый у Сайгон пачалі прысылаць сенсацыйныя і каўбойскія фільмы, кнігі і часопісы, якія сваімі рэакцыйнымі тэорыямі, дэкадэнцкім і мізантрапічным зместам атручвалі чалавечую думку. Гарады Ханой, Хуэ і Сайгон у час імперыялістычнай акупацыі былі насычаны гэтымі, так званымі «культурнымі» атрутамі.

У 1956 годзе, пры дапамозе місіі ЮНЕСКО, што знаходзілася ў Сайгоне, амерыканскія імперыялісты захапілі непасрэдна ў свае рукі службы друку і прапаганды, літаратурныя, артыстычныя і асветніцкія арганізацыі Паўднёвага В'етнама. У гэтым жа годзе паміж амерыканцамі і Нго Дзінь Дзьемам былі падпісаны шматлікія культурныя пагадненні, па якіх Дзьем не меў права самастойна набываць фільмаў, фатаграфій, кніг і газет, а амерыканскі ўрад сам павінен быў вырашаць пытанні аб выбары культурнай прадукцыі і пастаўцы яе амерыканскімі выдавецтвамі. Аплачваліся ўсе рахункі амерыканскіх агенцтваў у Сайгоне доларамі з фондаў амерыканскай дапамогі або паўднёвав'етнамскай манетай дзьемаўскіх улад. Па чарзе ў Сайгон прыязджалі многія выкладчыкі і спецыялісты ЗША і іх саюзнікаў, якія станавіліся саветнікамі ў розных галінах культуры Паўднёвага В'етнама, каб накіроўваць яе па шляху амерыканскай культуры. Курс літаратуры на амерыканскім факультэце ў Сайгоне быў адрэдагаваны амерыканскай рэдкалегіяй. Даволі дзіўным з'яўляецца тое, што і лекцыі па в'етнамскай археалогіі чытаюцца ва ўніверсітэце амерыканскім выкладчыкам Хавардам, які вельмі мала ведае пра в'етнамскую культуру; выкладанне геаграфіі В'етнама таксама вядзецца замежным выкладчыкам. У. Колінз, былы амерыканскі карэспандэнт, ветэран Туніса і Заходняй Германіі, цяпер — амерыканскі прэс-аташэ ў Сайгоне.

З пачатку 1957 года, разам з дзейнасцю амерыканскага інфармацыйнага агенцтва ў Сайгоне, краіны-сатэліты ЗША таксама пасылалі ва В'етнам «культурныя» групы, якія выступалі са спевамі, танцамі і п'есамі нездаровага зместу. На чале гэтых груп стаяць прыхільнікі псіхалагічнай вайны.

Усе гэтыя дзеянні амерыканцаў і іх клікі ў Паўднёвым В'етнаме накіраваны, галоўным чынам, на тое, каб распаліць псіхалагічную вайну ў галіне літаратуры і мастацтва. Амерыканскі часопіс «Рыпартэр» выказаўся шчыра пра палітыку ў Азіі: «Мы павінны пракласці шляхі для пошукаў сыравіны, значыць, перад намі стаіць важная задача заваёўваць і кіраваць кожнай краінай паасобку, каб завалодаць гэтай сыравінай».

Пачынаючы з 1950 года, у Індакітаі пад кіраўніцтвам Берслі запрацавала машына псіхалагічнай вайны і амерыканскага шпіянажу. У 1952 годзе для распальвання псіхалагічнай вайны сюды прыехала амерыканская місія, якою кіраваў Данальд Хіт. Пасля ўсталявання міру ў Індакітаі амерыканскія агенты згрупаваліся ў Сайгоне. Следам за ваеннай місіяй МААГ, палітычнай місіяй МСУ і эканамічнай місіяй ЮСОМ у Паўднёвы В'етнам прыехаў Лэнсдэйл з амерыканскага разведвальнага бюро на чале групы агентаў псіхалагічнай чайны, што дзейнічалі ў розных галінах па дырэктывах Лінібаго, рэакцыйнага амерыканскага тэарэтыка. Вось некаторыя з гэтых дырэктыў: «ператварыць страх у гнеў». «ператварыць цяжкасці ў недавер'е, добрую волю ў ажыятаж», «дзейнічаць такім чынам, каб выклікаць узбуджанасць». Кнігі, газеты, радыё, кіно павінны весці шумную і ў той жа час працяглую і ўпартую прапаганду, каб адцягнуць увагу людзей ад сваёвых дзеянняў, сацыяльных умоў і захапіць іх псіхозам вайны, навязаным амерыканцамі. Амерыканская асацыяцыя «Літаратура Усходу» — адна з соцень іншых арганізацый, якія пастаянна развіваюць гэтую тэорыю. Апроч таго, пад шыльдаю пагадненняў аб культурным супрацоўніцтве, ЗША прывозяць у Паўднёвы В'етнам кінафільмы і кнігі пра каўбояў, хуліганаў, каб прапагандаваць амерыканскую паліцыю сілы і амерыканскі лад жыцця і ператварыць вучняў, моладзь і паўднёвав'етнамскую армію ў галаварэзаў у адпаведнасці з мэтамі псіхалагічнай вайны.

Па яшчэ няпоўных статыстычных дадзеных, за апошнія сем год з ЗША прывезена ў Паўднёвы В'етнам каля 200 000 тон кніг, газет і часопісаў. Па лічбах, дадзеных дэпартаментам псіхалагічнай вайны ў Паўднёвым В'етнаме, толькі ў 1957 годзе амерыканцы ўвезлі туды да 29 270 брашур і друкаваных выданняў і 2 595 фільмаў у той час, як у самім Паўднёвым В'етнаме магло быць выдадзена толькі 300 брашур і друкаваных выданняў. У 1958 годзе з 500 фільмаў, увезеных з-за граніцы, 211 былі з ЗША і 192 — з Тайваня. Змест гэтых кніг, часопісаў, кінафільмаў, розных мастацкіх і культурна-асветных брашур і друкаваных выданняў круціцца ўвесь час вакол такіх тэорый і тэм, як ідэалізм, містыцызм, дэтэрмінізм, антыкамунізм, дэтэктывы, каўбоі, вайна і рамантычнае каханне.

Зусім нядаўна прыхільнікі псіхалагічнай вайны ў Сайгоне прапагандавалі канцэпцыю «падвоенага жыцця». На іх думку — зямля працягвае круціцца, час нікога не чакае, жыццё чалавека нядоўгае, і таму трэба карыстацца ўсімі радасцямі дня. Навошта «растрачваць» сваю маладосць і вясну? Гэта самая рэакцыйная тэорыя, мэта якой — атруціць думку чалавека і, у першую чаргу, зацягнуць моладзь у багну хуліганства, накіраваць яе па шляху падрыву і ліквідацыі рэвалюцыі ў Паўднёвым В'етнаме.

Калі барацьба паўднёвав'етнамскага насельніцтва дасягнула найвышэйшай мяжы, ЗША яшчэ больш узмацнілі сваю дзейнасць у галіне культуры Паўднёвага В'етнама. Яна ідзе побач з іх тэрарыстычнымі мерамі і карнымі экспедыцыямі.

Такім чынам амерыканскімі культурнымі місіямі ў Паўднёвым В'етнаме былі выкарыстаны ўсе мастацкія і літаратурныя гворы, накіраваныя на тое, каб прымусіць моладзь ісці на службу ў наёмныя арміі амерыканцаў ці займацца хуліганскімі ўчынкамі. Не задавальняючыся атручваннем моладзі шляхам вывучэння біяграфіі Гітлера, амерыканцы нядаўна на экранах Паўднёвага В'етнама дэманстравалі фільм аб дзейнасці гэтага «самазванца № 1», а філасофскія містычныя ідэалістычныя тэорыі аб душы і метэмпсіхозе сталі цяпер асноўным прадметам ва універсітэтах Паўднёвага В'етнама. Вось яна, амерыканская культура!

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, В. Ул. ІВАШЫН, А. Н. МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), П. Ф. ПРЫХОДЗЬКА, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), М. Г. ТКАЧОЎ, І. З. ШАРАХОЎСКІ, І. Б. ШАЦІЛА, Р. Р. ШЫРМА

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск. | Адрас рэдакцыі: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-25-25, аддзела літаратуры — 3-20-54, аддзела мастацтва — 1-24-62, аддзела культуры — 3-22-04, выдавецтва — 3-19-32, бухгалтэрыі — 3-11-03 | «Літаратура і мастацтва» выходзіць два разы на тыдзень: у аўторак і пятніцу

АТ 013129.

Друкарня выдавецтва «Звязда».